Спектакль з меткай «табу»

СТАР. 4

Нестандартныя балельшчыкі ў гандболе

СТАР. 5

Калі пачнём частаваць майскай малінай?

СТАР. 8

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

10 ЧЭРВЕНЯ 2017 г. СУБОТА №109 (28473)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

СІЛА Ў ЯДНАННІ

Кіраўнік краіны прымае ўдзел у саміце Шанхайскай арганізацыі супрацоўніцтва

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка ў сваім выступленні на пасяджэнні Савета кіраўнікоў дзяржаў — членаў Шанхайскай арганізацыі супрацоўніцтва ў Астане зрабіў акцэнт на пытаннях бяспекі і на неабходнасці ўзмацнення эканамічнага вымярэння ў дзейнасці ШАС.

Кіраўнік беларускай дзяржавы адзначыў, што невялікі прамежак часу, які прайшоў з моманту далучэння Беларусі ў якасці назіральніка да Шанхайскай арганізацыі супрацоўніцтва, цалкам умацаваў беларускі бок у правільнасці зробленага выбару. «Я натуральна тут выступаю як уважлівы назіральнік за тымі працэсамі, якія адбываюцца сёння ў ШАС», — сказаў ён.

Згуртаванасць і адзінства

Паводле слоў Прэзідэнта, ШАС імклівa і паступальна ператвараецца ў адну з самых уплывовых міжнародных структур. «Ва ўмовах рэгіянальных канфліктаў, што ўсё больш узмацняюцца, асаблівую каштоўнасць набывае працэс збліжэння краін, якія прадстаўляюць больш за палову насельніцтва планеты», — заявіў беларускі лідар.

У сувязі з гэтым Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу на нядаўнюю перасцярогу Прэзідэнта Расіі Уладзіміра Пуціна аб нейкім гіпатэтычным сутыкненні ЗША і Расіі. Адказваючы на пытанне журналіста, расійскі лідар, у прыватнасці, сказаў, што ніхто ў выніку падобнага сутыкнення не зможа гэтага перажыць. «Вельмі правільна і вельмі надзённа. Асаблівасць ШАС сёння заключаецца ў тым, што пры жаданні ўсіх членаў арганізацыі ніхто нідзе і ніколі не зможа дэстабілізаваць абстаноўку ў свеце. У гэтым велізарны патэнцыял ШАС, і гэта трэба бачыць. Гэта найвялікшая каштоўнасць, якая сёння створана», — падкрэсліў кіраўнік беларускай дзяржавы.

«Згуртаванасць і адзінства — той ключавы фактар супрацьстаяння сучасным выклікам і пагрозам, уключаючы тэрарызм, экстрэмізм, арганізаваную злачыннасць», — упэўнены Прэзідэнт Беларусі. Паводле яго слоў, сведчаннем умацавання аўтарытэту ШАС, у тым ліку яго эканамічнага вымярэння, з'яўляецца павелічэнне колькасці краін, якія падтрымліваюць шанхайскі дух раўнапраўнага ўзаемавыгаднага і мірнага суіснавання народаў.

«Дзве наймагутнейшыя дзяржавы — Індыя і Пакістан — становяцца яе паўнапраўнымі членамі. Гэта не проста найважнейшы вынік саміту, а мужны і адказны крок нашай арганізацыі, — сказаў Аляксандр Лукашэнка. — Не будзем скрываць, ёсць пэўныя праблемы ў адносінах паміж гэтымі цудоўнымі наймагутнейшымі дзяржавамі. І тое, што вы іх сёння прынялі ў склад ШАС, кажа пра тое, што вы проста адказныя людзі. Гэтым самым вы ўзялі на сябе рашэнне і гэтых праблем. Упэўнены, што, будучы членамі ШАС, і Індыя, і Пакістан не проста наблізяцца да вырашэння нейкіх невялікіх праблем, але яны іх вырашаць».

СТАР. 2

Фота БЕЛТА.

ЦЫТАТА ДНЯ

Уладзімір ПАНЦЮХОЎ, старшыня Пастаяннай камісіі па эканоміцы, бюджэце і фінансах Савета Рэспублікі:

«У аддаленых ад сталіцы рэгіёнах трэба больш актыўна развіваць прадпрымальніцтва і фермерства. Гэта будзе садзейнічаць больш эфектыўнаму выкарыстанню наяўных рэсурсаў, стварэнню новых працоўных месцаў, прыцягненню ў раёны інвестыцый, а фермерства — яшчэ і замацаванню людзей на роднай зямлі. Для гэтага нам трэба ствараць прывабныя ўмовы гаспадарання ў глыбінцы, выраўноўваць дыспрапорцыі рэгіянальнага развіцця».

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 10.06.2017 г.

Долар ЗША		1,8758 ▲
Еўра		2,0985 ▼
Рас. руб.		0,0329 ▲
Укр. грыўня		0,0717 ▲

■ Парламенцкая дыпламатыя

20 КРАІН УЖО ПАДТРЫМАЛІ РЭЗАЛЮЦЫЮ БЕЛАРУСІ

Сумесную работу ў міжнароднай плоскасці абмеркавалі беларускія і эстонскія дэпутаты падчас сустрэчы ў Палаце прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу. Асобнай тэмай стала летняя сесія Парламенцкай асамблеі АБСЕ, якая ўжо менш чым праз месяц пройдзе ў нашай сталіцы.

— Для нас гэта вельмі важнае, вельмі адказнае мерапрыемства, — падкрэсліў **намеснік старшыні Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Баляслаў ПІРШТУК.** — Сярод іншага мы будзем прапаноўваць і сваю рэзалюцыю. На нашу думку, тэма дастаткова актуальная: мы прапануем сістэму мер, накіраваных на процідзеянне з'яўленню новых псіхаактыўных рэчываў. Мне здаецца, літаральна для ўсіх краін гэтая праблема відавочная. З'яўленне новых псіхаактыўных рэчываў асабліва моцна ўплывае на нашу моладзь. У цяперашні момант 20 з 57 дэлегацый, якія прымуць удзел у летняй сесіі, падтрымалі нашу рэзалюцыю. Мы будзем удзячны, калі парламентарыі Эстоніі, якія будуць прымаць удзел і якія з'яўляюцца членамі дэлегацыі ПА АБСЕ, таксама далучацца да гэтай рэзалюцыі.

Акрамя гэтага, віцэ-спікер Палаты прадстаўнікоў звярнуў увагу, что Беларусь хоча атрымаць статус назіральніка ў Парламенцкай канферэнцыі Балтыйскага мора.

— Мы ведаем вашы пазіцыі, ваш аўтарытэт і вагу. Нам бы хацелася, каб мы і тут былі добрымі партнёрамі, — адзначыў Баляслаў Пірштук.

Надзея ЮШКЕВІЧ. *yushkevich@zviazda.by*

■ Полюс інтарэсаў

У АНТАРКТЫДУ — ПА КОНКУРСЕ ПРАЕКТАЎ

Днямі ўдзельнікі дзявятай Беларускай антарктычнай экспедыцыі, якая нядаўна вярнулася з самага паўднёвага кантынента, паўдзельнічалі ва ўрачыстай сустрэчы з навуковай грамадскасцю ў Нацыянальнай акадэміі навук. Палярнікі расказалі пра вынікі сёлетняй навуковай і будаўнічай работы ў Антарктыцы, падзяліліся планамі на будучыню, а таксама прадэманстравалі кіраўніцтву НАН і вядомым вучоным невялікі фільм пра ўзвядзенне беларускай станцыі і даследаванні ў палярных умовах.

— Наша работа прайшла ў штатным рэжыме, — расказаў **кіраўнік Беларускай антарктычнай экспедыцыі Аляксей ГАЙДАШОЎ.** — Зазначу, што навуковыя і лагістычныя пытанні з кожным годам вырашаюцца ўсё прасцей. Адбіваецца досвед і здабытая праца на Вялікай зямлі, якая папярэднічае экспедыцыі.

Адной з галоўных задач палярнікаў сёлета быў пачатак мантажу другога аб'екта Беларускай антарктычнай станцыі. Ён будзе ўяўляць з сябе вялікую платформу з размешчанымі на ёй васьмю секцыямі службовага модуля. Мантаж прайшоў паспяхова — «фундамент» быў змацаваны за рэкордна кароткі час (32 гадзіны), пасля чаго зверху ўсталявалі першы з васьмі блокаў. Астатнія секцыі будуць дастаўлены ў Антарктыду ў найбліжэйшыя гады.

Навуковыя даследаванні праводзіліся па пяці кірунках, замацаваных у дзяржаўнай праграме. Вынікі практычна кожнага з іх могуць быць прыменены ў разнастайных сферах дзейнасці: навуцы, прамысловасці, народнай гаспадарцы. Першы — вывучэнне газавага складу атмасферы. Праблема глабальнага пацяплення з'яўляецца вельмі актуальнай, і наша краіна хоча зрабіць свой унёсак у яе вырашэнне. Другі — вывучэнне азонавага слоя. Палярнікі займаліся вывучэннем так званых азонавых дзірак, сачылі за фактарамі іх з'яўлення і перыядычнасцю, высвятлялі, ці ўплывае на гэта дзейнасць чалавека.

Трэці аспект работы — мікрабіялагічныя даследаванні. Справа ў тым, што некаторыя мікраарганізмы, што насяляюць Антарктыку, валодаюць унікальнымі ўласцівасцямі. Напрыклад, бактэрыі, якія пры неспрыяльных умовах упадаюць у анабіёз на тысячы гадоў, пасля чаго ўзнаўляюць сваю дзейнасць. Айчынныя навукоўцы ўпэўнены, што ў найбліжэйшы час чалавецтва чакаюць прарыўныя тэхналогіі ў медыцыне і фармакалогіі, заснаваныя ў тым ліку і на даследаваннях гэтых істот. Марскія біялагічныя рэсурсы — яшчэ адзін кірунак работы. У прыбярэжных водах Антарктыкі можна ў абмежаваных маштабах праводзіць іх здабычу, таму

Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

нашы палярнікі актыўна вывучалі фаўну, якая насяляе раён Беларускай антарктычнай станцыі, з мэтай ацэнкі запасаў і падачы заяўкі для атрымання квот на выкарыстанне пэўных відаў гэтых рэсурсаў. Яшчэ адзін кірунак — экалагічныя даследаванні. Зона Антарктыкі аб'яўлена сусветным запаведнікам з вельмі жорсткім рэгуляваннем дзейнасці чалавека. Беларускія навукоўцы штогод адбіраюць пробы зямлі, паветра, снегу, донных адкладанняў, каб папярэдзіць негатыўны ўплыў уласнай работы на прыроду Антарктыды.

— Для нас важна, што існуе амбіцыйны і важны для краіны праект, ёсць праграма па яго рэалізацыі, акрэслены практычныя вынікі, якія трэба атрымаць, склаўся калектыў спецыялістаў-прафесіяналаў, якія займаюцца гэтым пытаннем, — адзначыў Аляксей Гайдашоў. — Самае галоўнае — не збаўляць абароты і тэмпы фінансавання. Іх не трэба нарошчваць, на наступныя гады грошы размеркаваны адэкватна і раўнамерна. Але калі раптам у нашай працы выпадзе які-небудзь год, то гэта фактычна будзе азначаць канец праекта, такой сітуацыі нельга дапусціць ні ў якім разе.

У наступныя два гады плануецца завяршыць мантаж другога аб'екта Беларускай антарктычнай станцыі. На платформе з'явяцца жылыя, санітарна-гігіенічныя, лабараторныя і амбулаторна-хірургічныя секцыі. Акрамя гэтага, на станцыі пабудуюць новы комплекс больш магутнай дызельнай электрастанцыі. Гэта абавязковыя ўмовы для далейшых даследаванняў, бо па планах НАН ужо ў 2019—2020 гадах палярнікі павінны перайсці да круглагадовага знаходжання ў Антарктыдзе. Такі крок дазволіць збіраць больш дакладныя навуковыя звесткі (бо даследаванні не будуць перарывацца з ад'ездам удзельнікаў), а таксама эканоміць грошы.

— Хачу сказаць, што работа палярнікаў — гэта праца на мяжы з подзвігам, — адзначыў **першы намеснік старшыні Прэзідыума НАН, акадэмік Сяргей ЧЫЖЫК.** — Жыць на працягу практычна паловы года ў цяжкіх умовах, збіраць вялікія аб'ёмы даных — вельмі няпроста. Мы імкнёмся ствараць для іх лепшыя ўмовы, будуем уласную інфраструктуру, падключаем да даследаванняў новых навукоўцаў, у тым ліку маладых. Цяпер звесткі, атрыманыя палярнікамі, перадаюцца ў інстытуты, праходзіць іх апрацоўка. Вельмі важна, што мы ўваходзім у склад краін, якія маюць свой пункт на гэтай далёкай зямлі. Ужо сёлета плануем правесці конкурс, падчас якога будуць адабраны ідэі для рэалізацыі падчас наступных экспедыцый.

Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ. *lyskavets@zviazda.by*

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

Вялікабрытанія атрымала «падвешаны» парламент

Па выніках усеагульных выбараў у Вялікабрытаніі будзе сфарміраваны «падвешаны» парламент, у якім ні адна з партый не атрымае большасці. Хто сфарміруе ўрад — невядома.

Сітуацыя, якая склалася, патрабуе перагаворaў па стварэнні кааліцыйнага ўрада. Іншы варыянт — фарміраванне ўрада меншасці, аднак ён рызыкуе быць няўстойлівым. Гэта будзе трэці «падвешаны парламент» з моманту завяршэння Другой сусветнай вайны і другі за апошнія два гады.

Аналітыкі ўжо называюць зыход галасавання катастрафічным для прэм'ер-міністра. Тэрэза Мэй, аб'явіўшы ў красавіку датэрміновыя выбары, мела намер узмацніць свае пазіцыі ў парламенце перад складанымі перагаворамі з нагоды выхаду краіны са складу ЕС (яны павінны стартаваць ужо 19 чэрвеня). Тым часам у стане апазіцыйных лейбарыстаў і нават саміх кансерватараў сталі гучаць заклікі да адстаўкі прэм'ер-міністра.

Як паведамляе агенцтва Reuters, лідар лейбарыстаў Джэрэмі Корбін заклікаў Мэй пайсці ў адстаўку ў сувязі з вынікамі выбараў. «Прэм'ер-міністр склікала гэтыя выбары, таму што яна хацела атрымаць мандат. Што ж, мандат, які яна атрымала, — гэта страчаныя месцы кансерватараў, страчаныя галасы, страчаная падтрымка і страчаная ўпэўненасць. Я думаю, што гэтага дастаткова для яе, каб сысці», — сказаў палітык.

Сама ж Тэрэза Мэй не збіраецца ў адстаўку. Кіраўнік Кабміна запытае ў каралевы Лізаветы II дазвол сфарміраваць новы ўрад, паведамляе Reuters.

Як пазней стала вядома, прэм'ер-міністр Вялікабрытаніі Тэрэза Мэй дамовілася аб фарміраванні новага кааліцыйнага ўрада з Дэмакратычнай юніянісцкай партыяй Паўночнай Ірландыі, паведамляе The Guardian.

Немцы даравалі Меркель міграцыйны крызіс і гатовыя аддаць за яе галасы на выбарах

Папулярнасць федэральнага канцлера Германіі Ангелы Меркель дасягнула таго ж узроўню, што і да пачатку міграцыйнага крызісу. Пра гэта сведчаць даныя апытання ARD-Deutschlandtrend. У рэйтынгу вядучых палітыкаў кіраўнік Хрысціянска-дэмакратычнага саюза (ХДС) дамаглася свайго найлепшага паказчыка са жніўня 2015 года: 64 працэнты рэспандэнтаў задаволеныя работай канцлера — гэта на адзін працэнтны пункт больш, чым месяц таму.

У той жа час галоўны сапернік Меркель на выбарах у бундэстаг Марцін Шульц атрымаў падтрымку толькі 36 працэнтаў апытаных, што стала самым нізкім яго паказчыкам за ўсю гісторыю апытання ARD-Deutschlandtrend. У параўнанні з вынікам папярэдняга месяца кіраўнік СДПГ страціў 6 працэнтных пунктаў.

Разрыў паміж Меркель і Шульцам адлюстраваны і ў апытанні пра тое, за каго рэспандэнты прагаласавалі б, калі б выбары праходзілі цяпер. За дзеючага канцлера прагаласавалі б 53 працэнты (на 4 пункты больш, чым месяцам таму), а за лідара СДПГ — 29 працэнтаў (на 7 пунктаў менш, чым месяц таму) удзельнікаў даследавання.

Выбары ў бундэстаг ФРГ пройдуць сёлета 24 верасня.

Унучка Хрушчова загінула пад коламі электрычкі ў Маскве

Як паведамляецца, 77-гадовая Юлія Хрушчова пераходзіла чыгуначныя пуці ў неналежным месцы.

У прэс-службе ўпраўлення па транспарце МУС Расіі па ЦФА ТАСС пацвердзілі інфармацыю пра факт смяротнага траўміравання пажылой жанчыны на чыгуначных пуцях.

Юлія Хрушчова — дачка Леаніда Хрушчова, сына былога першага сакратара ЦК КПСС Мікіты Хрушчова. Пасля таго як Леанід Хрушчоў у час вайны знік без вестак, Мікіта Хрушчоў удачарыў унучку.

ISSN 1990 - 763X

КАРАТКА

Беларусь у студзені-красавіку 2017 года павялічыла экспарт тавараў і паслуг на 19,5 працэнта да $10,413 млрд у параўнанні са студзенем—красавіком 2016-га.

Нацыянальны аэрапорт Мінск з 00.00 10 чэрвеня спыніў аказанне паслуг за наяўную валюту. Разлікі цяпер будуць праводзіцца за наяўныя беларускія рублі альбо ў безнаяўнай форме банкаўскімі карткамі. Пры гэтым юрыдычныя асобы, якія аказваюць названыя паслугі, па-ранейшаму будуць мець права атрымліваць замежную валюту ад фізічных асоб — нерэзідэнтаў у безнаяўным парадку з-за межаў Беларусі.

Індэкс спажывецкіх цэн на тавары і паслугі ў маі склаў 100,3%.

Месцы для караванераў з'явяцца на трасе М6 Мінск — Гродна. У месцах для адпачынку можна будзе падзарадзіць электрапрыборы дамоў на колах, набраць вады, прыняць душ і інш.

Беларускамоўную версію французскага мультфільма «Маленькі прынц» для гледачоў у сталіцы пакажуць 23—25 чэрвеня.

У Кобрыне супрацоўніца букмекерскай канторы прысвоіла больш за Br920.

■ Я зноў выбіраю «Звязду»

«Ты нам заўжды давала сілы»

...Успамінаючы маленства, прыгадаў, што газету «Звязда» выпісваў яшчэ мой дзядуля Нічыпар, а мы з жонкаю — дык заўжды з таго часу, як стварылі сям'ю. Значыць, можна смела сцвярджаць, што «Звязда» — наша сямейная газета.

Цудоўна, што яна выдаецца па-беларуску і тым самым дапамагае людзям адчуваць сябе сваімі на сваёй зямлі, з любоўю да роднай мовы, да Бацькаўшчыны, выхоўваць дзяцей. Ва ўсякім разе трое нашых сыноў, як толькі навучыліся чытаць, з нецярпеннем чакалі новага нумара, а потым яшчэ і самі друкаваліся. Гэта, мусіць, па-першае.

Па-другое, мы любілі і любім «Звязду» за тое, што ў ёй працуюць патрыёты і сапраўдныя прафесіяналы. Узяць хоць бы здымкі Анатоля Клешчука, «Фотасловы» Яўгена Пясецкага... Ёсць на што паглядзець і над чым падумаць!

Ёсць, вядома ж, і што чытаць. Для нас, настаўнікаў, гэта перш за ўсё асвятленне праблем адукацыі. Тут «Звязда» можа даць фору любому выданню (нават нашаму прафесійнаму). З цікавасцю чытаем звяздоўскую «Сямейную газету», «Чырвонку», «Неасабісты суб'ектыў» Алены Ляўковіч, «Нефармат» Святланы Яскевіч, «Жырандолю», з захапленнем і заўсёды — «...Народ на провадзе!», «Хто каго?» і, вядома ж, «Простую мову» Валянціны Доўнар. Ганарымся, што маем дзве кніжкі яе абразкоў...

Да таго ж, дзякуючы газеце, заўсёды ведаем, што адбываецца ў краіне і свеце, чым жывуць вайскоўцы, спартсмены, мясцовыя Саветы... З «Крынічкай» і «Хатняй энцыклапедыяй» вучымся гаспадарыць, з карысцю бавім час, разгадваючы крыжаванкі... Іншымі словамі,

«Звязда» заўжды давала сілы,
Бадзёрасць духу і настрой.
Сто год была з народам шчырай
І заставайся з ім такой!

Уладзімір Антонавіч ПАПЛЁЎКА, *г. Лагойск.*

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

ПІШАМ ПРА ТОЕ, ШТО САПРАЎДЫ ВАЖНА,
5 разоў на тыдзень!
Ідзе падпіска на «Звязду» на III квартал і II паўгоддзе 2017 года!
ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!

СІЛА Ў ЯДНАННІ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Карыстаючыся выпадкам, Аляксандр Лукашэнка павіншаваў з гэтай падзеяй прэм'ер-міністра Індыі Нарэндра Модзі і прэм'ер-міністра Пакістана Навааза Шарыфа.

Бяспека — непадзельная

Прэзідэнт запэўніў, што Беларусь, знаходзячыся на «заходнім рубяжы» ШАС, як донар рэгіянальнай стабільнасці гатова на справе ўносіць свой канкрэтны ўклад у дасягненне мэтаў арганізацыі зыходзячы з неабходнасці ўсеагульнай і непадзельнай бяспекі.

«Лічу, што ў спалучэнні з намаганнямі «шанхайскай сям'і» захоўвае сваю актуальнасць беларуская ініцыятыва аб наладжванні новага маштабнага дыялогу паміж Усходам і Захадам, аналагічнага Хельсінкскаму працэсу. Шанхайскую арганізацыю сёння немагчыма праігнараваць ні па адным з пытанняў парадку дня сусветнага развіцця. Маючы негатыўны вопыт падзелу і войнаў, наша краіна адначасова служыць пазітыўным прыкладам мірнага суіснавання культур і рэлігій», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

Умацаванне эканамічнага вымярэння

Кіраўнік беларускай дзяржавы заявіў, што сацыяльная нестабільнасць, якая расце ў асобных краінах і рэгіёнах, цесна звязана з узроўнем іх развіцця. «Прычына нестабільнасці менавіта ў гэтым. Скажу шчыра: сёння Еўропа пакутуе ад наплыву бежанцаў, дык вось, калі б Еўропа не адгароджвалася і не дэстабілізавала гэты рэгіён, а дапамагла, то сёння не мела б гэтай праблемы. Заява Сі Цзіньпіна аб тым, што Кітай будзе садзейнічаць развіццю дзяржаў не толькі ШАС, але і па перыметры арганізацыі, якраз вельмі важная з пункту гледжання вырашэння гэтай страшнай праблемы нелегальнай міграцыі, якая вядзе да глабальнага тэрарызму. Перакананы, што ўмацаванне эканамічнага вымярэння ШАС будзе садзейнічаць вырашэнню гэтага няпростага пытання», — сказаў Прэзідэнт. Ён прапанаваў падумаць над распрацоўкай канкрэтных праектаў (эканамічных, інвестыцыйных, лагістычных, гуманітарных), у тым ліку з актыўным прыцягненнем дзяржаў-назіральнікаў.

«Мы падтрымліваем ініцыятыву аб неабходнасці гарантавання харчовай бяспекі на кантыненце. Праблема нарастае. З'яўляючыся буйным вытворцам харчовай прадукцыі, Беларусь паслядоўна выступае за зняцце штучных бар'ераў у гэтай сферы», — адзначыў кіраўнік дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка назваў сімвалічным той факт, што саміт у Астане па часе фактычна супадае з пачаткам работы міжнароднай спецыялізаванай выстаўкі «ЭКСПА-2017», якая прысвечана энергіі будучыні. «Гэты сусветны агляд дасягненняў дазволіць пашырыць эканамічную кааперацыю членаў ШАС і іх партнёраў», — упэўнены ён.

Сувязнае звяно паміж Еўропай і Азіяй

Прэзідэнт заявіў, што ў Беларусі надаюць вялікае значэнне вырашэнню задач па ліквідацыі перашкод на шляху руху тавараў, паслуг, капіталаў і рабочай сілы ў Еўразіі.

«Вырашыўшы гэтую праблему, мы зробім так, што свет наогул перастане пра яе гаварыць», — падкрэсліў беларускі лідар. «Сённяшняя сустрэча, па сутнасці, з'яўляецца працягам таго лёсавызначальнага дыялогу, які мы вялі ў Пекіне ў рамках міжнароднага форуму «Адзін пояс і адзін шлях». Гэта адзін з глабальных прыкладаў, у такім кірунку павінна развівацца наша арганізацыя, — сказаў Аляксандр Лукашэнка. — Бясспрэчна, гэта наймагутнейшы стымул для развіцця не толькі ШАС, але і Еўразіі, усяго свету. Форум прадэманстраваў зацікаўленасць большасці краін свету ў рэалізацыі такога беспрэцэдэнтнага па маштабе праекта».

«Мы гатовыя ўзмацняць ролю Беларусі як сувязнага звяна паміж Еўропай і Азіяй і прапануем партнёрам больш актыўна выкарыстоўваць гэты патэнцыял», — адзначыў беларускі лідар.

* * *

Прэзідэнт таксама правёў перагаворы з замежнымі лідарамі ў кулуарах саміту Шанхайскай арганізацыі супрацоўніцтва. Кіраўнік дзяржавы прадукцыйна і прадметна пагутарыў з прэм'ер-міністрам Індыі Нарэндра Модзі, які запрасіў Прэзідэнта наведаць гэтую краіну восенню. Грунтоўная размова на палях форуму адбылася з прэм'ер-міністрам Пакістана Навазам Шарыфам напярэдадні яго візіту ў жніўні ў Беларусь. Адбыліся таксама сустрэчы з кіраўнікамі Расіі, КНР, Афганістана і Таджыкістана. Зацікаўленасць у візіце Аляксандра Лукашэнкі для выпрацоўкі новага парадку дня ва ўзаемадзеянні дзвюх краін выказаў падчас перагавораў і міністр замежных спраў Ірана. Раней Аляксандр Лукашэнка сустрэўся з генеральным сакратаром ААН Антоніу Гутэрышам.

Паводле БЕЛТА.

■ Супрацоўніцтва

САЮЗНАЯ ДЗЯРЖАВА — ПРЫКЛАД ДЛЯ ЎСЯГО СВЕТУ

На думку Надзвычайнага і Паўнамоцнага Пасла Расіі ў Беларусі Аляксандра СУРЫКАВА, у многіх напрамках узаемадзеянне народаў Беларусі і Расіі ў Саюзнай дзяржаве яшчэ доўга будзе прыкладам для ўсіх інтэграцыйных утварэнняў былых рэспублік СССР і іншых міжнародных фарміраванняў. Падчас прэс-канферэнцыі, прымеркаванай да Дня Расіі, ён таксама падкрэсліў, што захаванне Саюзнай дзяржавы неабходна нават пры ўмове, што абедзве краіны з'яўляюцца членамі ЕАЭС.

«Вопыт Саюзнай дзяржавы дапамог запусціць праект ЕАЭС. Далейшая актывізацыя расійска-беларускага ўзаемадзеяння і паскарэнне ўзаемавыгадных інтэграцыйных працэсаў адпавядаюць карэнным інтарэсам дзвюх краін. Пры гэтым, магчыма, спатрэбіцца актуалізаваць іх нейкім дагаворам у Саюзнай дзяржаве з улікам пераходу эканомікі ў большай ступені ў ЕАЭС», — лічыць Аляксандр Сурыкаў.

Ён таксама пракаментаваў спрэчныя пытанні, якія ўзнікаюць пры пастаўках харчовай прадукцыі Беларусі ў Расію. «Так, сапраўды ёсць пытанні, якія звязаны са зменамі заканадаўства ў сувязі са стварэннем ЕАЭС і прыняццем рэгламентаў. Шмат спрэчак аб рэшткавых леках у малочнай прадукцыі. Я думаю, што ў хуткім часе яны ўрэгулююцца рашэннем Еўрапейскай эканамічнай камісіі. Яна можа пашырыць спіс лекаў або прымяніць яго па дамоўленасці паміж дзвюма краінамі», — растлумачыў Аляксандр Сурыкаў.

Ён дадаў, што аналагічныя спрэчкі ўзнікаюць цыклічна з-за коштаў на энерганосьбіты. На думку пасла, яны знікнуць са стварэннем адзінага рынку газу да 2025 года. Расійскі бок таксама паспрабуе ў двухбаковым фармаце стварыць яго раней.

Акрамя таго, дзве краіны да канца гэтага года вызначацца па шасці інтэграцыйных праектах. «Пачалася праца нашых мінпрамаў, а трэба было б яшчэ мінсельгасам папрацаваць. Пакуль ідзе праца, якая збліжае паняцці», — адзначыў Аляксандр Сурыкаў. Беларусь разглядае рэалізацыю праектаў у галіне машынабудавання і нафтахіміі, Расія — у АПК і іншых сферах. «Думаю, што мы да канца года вызначымся, якія гэта праекты, што гэта такое. Відавочна, што інтэграваць эканомікі трэба глыбей, калі мы хочам устойлівага развіцця Еўразійскага эканамічнага саюза. Да канца года мы будзем мець карціну па праектах», — рэзюмаваў пасол. Як паведамлялася, Беларусь і Расія дамовіліся прапанаваць адна адной па тры інтэграцыйныя праекты. Формы супрацоўніцтва па іх могуць быць рознымі — гэта і абмен актывамі, і купля пэўнага пакета акцый.

***

Аляксандр Сурыкаў паведаміў, што ўезд для грамадзян Беларусі ў расійскіх аэрапортах плануецца палегчыць. Пасля таго як самалёты з Беларусі перавялі ў міжнародныя тэрміналы расійскіх аэрапортаў, пасажыры праходзяць памежны кантроль. У далейшым для беларусаў кантроль паспрабуюць спрасціць, каб не было нават неабходнасці сканаваць пашпарт.

Таксама пасол адзначыў, што ёсць пытанне па чартарных рэйсах — грамадзяне Беларусі лятаюць на працу ў Заходнюю Сібір чартарам, і цяпер вядзецца дыялог паміж пагранслужбамі, каб зрабіць гэты працэс па паведамляльнай прыкмеце. Мяркуецца, што створаць спіс, які будзе перадавацца расійскай пагранслужбе, і людзі па прыбыцці не будуць праходзіць ніякіх працэдур.

Паралельна вядзецца работа, якая палегчыць доступ замежным грамадзянам з Расіі ў Беларусь. «Мы хочам спрасціць гэты працэс шляхам узаемнага прызнання віз: калі віза выдадзена расійскімі ўстановамі замежнаму грамадзяніну, то на тэрыторыі Беларусі ён праходзіць хутчэй і наадварот», — растлумачыў Аляксандр Сурыкаў.

Ілья КРЫЖЭВІЧ. *Kryzhevich@zviazda.by*

■ Парламенцкі дзённік

ДЭПУТАТЫ НАПРАЦОЎВАЮЦЬ КАНТАКТЫ

Парламентарыі робяць істотны ўнёсак у развіццё дыпламатычных кантактаў нашай краіны, а таксама ў наладжванне дзелавых сувязяў паміж нашымі рэгіёнамі, прадпрыемствамі і замежнымі партнёрамі. Падчас сустрэчы намесніка старшыні Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларуса ПІРШТУКА з дэпутатамі Нацыянальнай асамблеі Эквадора размова ішла як пра развіццё міжпарламенцкіх сувязяў, так і пра іншыя кірункі супрацоўніцтва дзвюх дзяржаў.

ПАТЭНЦЫЯЛ ДЛЯ ТАВАРААБАРОТУ

Апошнім часам беларуска-эквадорскія адносіны развіваюцца даволі імкліва. Пасля таго як у 2012 годзе кіраўнік нашай краіны Аляксандр Лукашэнка наведаў Эквадор з афіцыйным візітам, дзяржавы абмяняліся пасольствамі, запрацавала Беларуска-эквадорская камісія па гандлі і эканамічным развіцці.

— У нас адбылася дастаткова вялікая колькасць узаемных візітаў, — канстатаваў віцэ-спікер ніжняй палаты. — Закладзена добрая, на маю думку, база ў нашых адносінах: як на ўзроўні лідараў краін, так і на ўзроўні парламентаў, урадаў.

Баляслаў Пірштук выказаў спадзяванні, што ў хуткім часе будуць ратыфікаваны гандлёва-эканамічныя пагадненні па выключэнні двайнога падаткаабкладання. Акрамя гэтага, у канцы мая Беларусь і Эквадор падпісалі пагадненне аб прызнанні дакументаў аб адукацыі і дыпломаў аб вышэйшай адукацыі.

Што да міжпарламенцкіх адносін, то заканадаўцы абедзвюх краін трымаюць добры кантакт. Так, Эквадор падтрымаў Беларусь, і цяпер мы маем статус назіральніка ў Лацінаамерыканскім парламенце. У той жа час і папрацаваць ёсць над чым:

— Вельмі разлічваю, што больш актыўна будуць працаваць нашы парламенцкія рабочыя групы. Спадзяюся, што мы зможам у нашы адносіны прыўносіць добрыя канкрэтныя кантакты і адпаведна добрыя мерапрыемствы. Тавараабарот, які мы маем паміж нашымі краінамі, дастаткова сціплы. У нас ёсць шмат таварных груп, якія б мы маглі пастаўляць вам, вы маглі б пастаўляць тавары пэўнага кірунку ў Рэспубліку Беларусь. Мы маглі б у разы павялічыць нашы лічбы, — упэўнены Баляслаў Пірштук.

БЯЗВІЗАВЫ РЭЖЫМ У ДАПАМОГУ

Падчас сустрэчы Баляслава Пірштука з **намеснікам галоўнага ўпраўляючага Нямецкага саюза прамыслова-гандлёвых палат Фолькерам ТРАЕРАМ** абмяркоўваліся ў першую чаргу пытанні дзелавога ўзаемадзеяння.

Віцэ-спікер ніжняй палаты падкрэсліў: адносіны Беларусі і Германіі падтрымліваюцца на дастаткова прыстойным узроўні.

— Мы вельмі шмат запазычваем у Германіі ў тым, што датычыцца тэхналогій, падыходаў, — звярнуў увагу Баляслаў Пірштук. — Нам пашанцавала мець партнёра, які мае такія добрыя параметры ў эканоміцы: Германія — лепшая эканоміка Еўропы. Мы настроены на канструктыўную працу. У нас дастаткова шмат пытанняў: і вялікіх, і малых, якія нам неабходна пераадолець і вырашыць у найбліжэйшы час.

Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Федэратыўнай Рэспублікі Германія ў Беларусі Петэр Дэтмар станоўча ацаніў пяцідзённы бязвізавы рэжым, які ўвяла наша дзяржава для грамадзян 80 краін. Па яго словах, нямецкі бізнес зацікаўлены ў пашырэнні кантактаў з Беларуссю. Фолькер Траер звярнуў увагу, што кантакты паміж краінамі наладжаны добрыя, ёсць магчымасць своечасова інфармаваць партнёраў пра патэнцыял супрацоўніцтва.

Надзея ЮШКЕВІЧ.
yushkevich@zviazda.by

КРАІНА ЗАЦІКАЎЛЕНА Ў ІНВЕСТЫЦЫЯХ З ІЗРАІЛЯ

Нашу дзяржаву і Ізраіль звязвае вельмі многае. Прынамсі, у Беларусі яўрэі пражывалі многія стагоддзі. Родам з нашай краіны — цэлы шэраг вядомых грамадскіх, палітычных дзеячаў Дзяржавы Ізраіль. А зусім нядаўна — 26 мая — краіны адзначылі 25-годдзе са дня ўстанаўлення дыпламатычных адносін. З гэтай сапраўды святочнай датай амаль супаў візіт у нашу дзяржаву віцэ-спікера Кнэсэта (парламент Ізраіля) Талі ПЛОСКАЎ.

— Мы ведаем вас як чалавека, які вельмі актыўна працуе над развіццём двухбаковых адносін паміж Ізраілем і Рэспублікай Беларусь. Ёсць канкрэтныя вынікі, ваш асабісты ўнёсак. Вы прыклалі добрыя намаганні ў пытанні захавання пасольства Дзяржавы Ізраіль у Рэспубліцы Беларусь. Думаю, гэта вельмі добры пачатак і ў вашай парламенцкай дзейнасці, — заявіў **Уладзімір АНДРЭЙЧАНКА, старшыня Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу.**

Трэба сказаць, што Талі Плоскаў узначальвае парламенцкую групу сяброўства Ізраіль — Беларусь. У нашым парламенце адпаведную групу ўзначальвае Аляксандр Папкоў, старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні, які таксама прыняў удзел у сустрэчы. Паміж заканадаўчымі органамі наладжаны добрыя кантакты, так, Аляксандр Папкоў быў з візітам у Ізраілі.

Спікер ніжняй палаты звярнуў увагу на шэраг перспектыўных кірункаў двухбаковага супрацоўніцтва, асаблівую ўвагу ён удзяліў інвестыцыям. З ізраільскім капіталам у нашай краіне рэалізуецца больш за 150 праектаў.

* * *

У той жа дзень **Міхаіл МЯСНІКОВІЧ, старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу,** таксама правёў сустрэчу з гасцямі з Ізраіля. Падчас яе спікер верхняй палаты закрануў разнапланавыя сферы супрацоўніцтва дзвюх краін: інвестыцыі, фармацэўтыка, мікраэлектроніка, турызм і міжпарламенцкае супрацоўніцтва. «Мы хацелі б стварыць міжнародны фінансавы цэнтр. Гэта магло б быць вельмі актуальна. Калі б вы нам дапамаглі з рэалізацыяй гэтага праекта, мы былі б рады сумеснай працы», — прапанаваў спікер верхняй палаты беларускага парламента.

Надзея ЮШКЕВІЧ,
yushkevich@zviazda.by
Вераніка ПУСТАВІТ.
ustavit@zviazda.by

РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»

извещает о повторном открытом аукционе по продаже апартаментов и гаражных боксов в г. Сочи, находящихся в собственности Республики Беларусь и принадлежащих ГУ «Санаторий «Беларусь» на праве оперативного управления

№ лота	Описание лотов	Начальная цена с НДС, рос. руб.	Задаток, рос. руб.
Лот №1	Апартамент №001 (2-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1632. Назначение – нежилое. Этаж – цокольный этаж №2. Площадь –101,2 кв. м	12 710 276,00	1 271 027,60
Лот №2	Апартамент №002 (1-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1629. Назначение – нежилое. Этаж – цокольный этаж №2. Площадь – 59,7 кв. м	7 977 119,00	797 711,90
Лот №3	Апартамент №003 (1-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1633. Назначение – нежилое. Этаж – цокольный этаж №2. Площадь – 61,2 кв. м	8 177 011,00	817 701,10
Лот №4	Апартамент №004 (2-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1619 с отделкой. Назначение – нежилое. Этаж – цокольный этаж №2. Площадь – 99,6 кв. м	14 429 347,00	1 442 934,70
Лот №5	Апартамент №101 (2-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1624. Назначение – нежилое. Этаж – цокольный этаж №1. Площадь – 101,7 кв. м	13 785 409,00	1 378 540,90
Лот №6	Апартамент №104 (2-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1623. Назначение – нежилое. Этаж – цокольный этаж №1. Площадь – 100,8 кв. м	13 664 046,00	1 366 404,60
Лот №7	Апартамент №201 (3-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1528. Назначение – нежилое. Этаж – 2. Площадь – 172,4 кв. м	25 242 076,00	2 524 207,60
Лот №8	Апартамент №202 (3-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1529. Назначение – нежилое. Этаж – 2. Площадь – 170,9 кв. м	22 739 143,00	2 273 914,30
Лот №9	Апартамент №203 (2-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1546. Назначение – нежилое. Этаж – 2. Площадь – 103,1 кв. м	15 001 895,00	1 500 189,50
Лот №10	Апартамент №204 (1-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1547. Назначение – нежилое. Этаж – 2. Площадь – 69,4 кв. м	10 752 762,00	1 075 276,20
Лот №11	Апартамент №205 (2-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1530. Назначение – нежилое. Этаж – 2. Площадь – 116,7 кв. м	16 980 825,00	1 698 082,50
Лот №12	Апартамент №206 (2-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1531. Назначение – нежилое. Этаж – 2. Площадь – 98,7 кв. м	14 362 240,00	1 436 224,00
Лот №13	Апартамент №208 (3-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1533. Назначение – нежилое. Этаж – 2. Площадь – 172,9 кв. м	25 314 894,00	2 531 489,40
Лот №14	Апартамент №209 (1-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1534 с отделкой. Назначение – нежилое. Этаж – 2. Площадь – 60,6 кв. м	10 135 952,00	1 013 595,20
Лот №15	Апартамент №210 (2-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1535. Назначение – нежилое. Этаж – 2. Площадь – 97,7 кв. м	14 216 605,00	1 421 660,50
Лот №16	Апартамент №211 (2-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1527. Назначение – нежилое. Этаж – 2. Площадь –123,3 кв. м	17 941 735,00	1 794 173,50
Лот №17	Апартамент №301 (3-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1630. Назначение – нежилое. Этаж – 3. Площадь – 172,4 кв. м	25 242 076,00	2 524 207,60
Лот №18	Апартамент №302 (3-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1636. Назначение – нежилое. Этаж – 3. Площадь – 170,9 кв. м	25 022 195,00	2 502 219,50
Лот №19	Апартамент №303 (2-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1634. Назначение – нежилое. Этаж – 3. Площадь – 103,1 кв. м	15 001 895,00	1 500 189,50
Лот №20	Апартамент №305 (2-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1543. Назначение – нежилое. Этаж – 3. Площадь – 116,7 кв. м	16 980 825,00	1 698 082,50
Лот №21	Апартамент №306 (2-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1545. Назначение – нежилое. Этаж – 3. Площадь – 98,7 кв. м	14 362 240,00	1 436 224,00
Лот №22	Апартамент №308 (3-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1542. Назначение – нежилое. Этаж – 3. Площадь – 172,9 кв. м	25 314 894,00	2 531 489,40
Лот №23	Апартамент №309 (1-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1544. Назначение – нежилое. Этаж – 3. Площадь – 60,6 кв. м	9 389 213,00	938 921,30
Лот №24	Апартамент №310 (2-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1538. Назначение – нежилое. Этаж – 3. Площадь – 97,7 кв. м	14 216 605,00	1 421 660,50
Лот №25	Апартамент №311 (2-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1541. Назначение – нежилое. Этаж – 3. Площадь – 123,3 кв. м	17 941 735,00	1 794 173,50
Лот №26	Апартамент №401 (3-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1540. Назначение – нежилое. Этаж – 4. Площадь – 172,4 кв. м	25 242 076,00	2 524 207,60
Лот №27	Апартамент №402 (3-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1536. Назначение – нежилое. Этаж – 4. Площадь – 170,9 кв. м	25 022 195,00	2 502 219,50
Лот №28	Апартамент №403 (2-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1537. Назначение – нежилое. Этаж – 4. Площадь – 103,1 кв. м	16 305 476,00	1 630 547,60
Лот №29	Апартамент №404 (1-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1549. Назначение – нежилое. Этаж – 4. Площадь – 69,4 кв. м	11 108 284,00	1 110 828,40
Лот №30	Апартамент №405 (2-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1550. Назначение – нежилое. Этаж – 4. Площадь – 116,7 кв. м	18 457 171,00	1 845 717, 10
Лот №31	Апартамент №408 (3-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1568. Назначение – нежилое. Этаж – 4. Площадь – 172,9 кв. м	25 314 894,00	2 531 489,40
Лот №32	Апартамент №409 (1-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1569. Назначение – нежилое. Этаж – 4. Площадь – 60,6 кв. м	9 389 213,00	938 921,30
Лот №33	Апартамент №410 (2-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1570. Назначение – нежилое. Этаж – 4. Площадь – 97,7 кв. м	14 216 605,00	1 421 660,50
Лот №34	Апартамент №411 (2-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1572. Назначение – нежилое. Этаж – 4. Площадь – 123,3 кв. м	17 941 735,00	1 794 173,50
Лот №35	Апартамент №501 (3-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1564. Назначение – нежилое. Этаж – 5. Площадь – 172,4 кв. м	25 242 076,00	2 524 207,60
Лот №36	Апартамент №502 (3-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1565. Назначение – нежилое. Этаж – 5. Площадь – 170,9 кв. м	25 022 195,00	2 502 219,50
Лот №37	Апартамент №503 (2-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1578. Назначение – нежилое. Этаж – 5. Площадь – 103,1 кв. м	16 305 476,00	1 630 547,60
Лот №38	Апартамент №505 (2-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1593. Назначение – нежилое. Этаж – 5. Площадь – 116,7 кв. м	18 457 171,00	1 845 171,10
Лот №40	Апартамент №509 (1-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1553. Назначение – нежилое. Этаж – 5. Площадь – 60,6 кв.м	9 389 213,00	938 921,30
Лот №41	Апартамент №510 (2-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1567. Назначение – нежилое. Этаж – 5. Площадь – 97,7 кв. м	14 216 605,00	1 421 660,50
Лот №42	Апартамент №511 (2-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1571. Назначение – нежилое. Этаж – 5. Площадь – 123,3 кв. м	17 941 735,00	1 794 173,50
Лот №43	Апартамент №601 (3-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1573. Назначение – нежилое. Этаж – 6. Площадь – 172,4 кв. м	25 242 076,00	2 524 207,60
Лот №44	Апартамент №602 (3-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1576. Назначение – нежилое. Этаж – 6. Площадь – 170,9 кв. м	25 022 195,00	2 502 219,50
Лот №45	Апартамент №608 (3-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1557. Назначение – нежилое. Этаж – 6. Площадь – 172,9 кв. м	25 314 894,00	2 531 489,40
Лот №46	Апартамент №609 (1-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1587. Назначение – нежилое. Этаж – 6. Площадь – 60,6 кв. м	9 389 213,00	938 921,30
Лот №47	Апартамент №610 (2-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1558. Назначение – нежилое. Этаж – 6. Площадь – 97,7 кв. м	14 216 605,00	1 421 660,50
Лот №48	Апартамент №611 (2-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1594. Назначение – нежилое. Этаж – 6. Площадь – 123,3 кв. м	17 941 735,00	1 794 173,50
Лот №49	Апартамент №701 (3-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1595. Назначение – нежилое. Этаж – 7. Площадь – 172,4 кв. м	25 242 076,00	2 524 207, 60
Лот №50	Апартамент №702 (3-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1583. Назначение – нежилое. Этаж – 7. Площадь – 170,9 кв. м	25 022 195,00	2 502 219,50
Лот №51	Апартамент №703 (2-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1566. Назначение – нежилое. Этаж – 7-ой. Площадь – 103,1 кв. м	16 305 476,00	1 630 547,60
Лот №52	Апартамент №710 (2-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1580. Назначение – нежилое. Этаж – 7. Площадь – 97,7 кв. м	14 216 605,00	1 421 660,50
Лот №53	Апартамент №711 (2-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1575. Назначение – нежилое. Этаж – 7. Площадь – 123,3 кв. м	17 941 735,00	1 794 173,50
Лот №54	Апартамент №801 (3-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1574. Назначение – нежилое. Этаж – 8. Площадь – 172,4 кв. м	25 242 076,00	2 524 207,60
Лот №55	Апартамент №802 (3-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1600. Назначение – нежилое. Этаж – 8. Площадь – 170,9 кв. м	25 022 195,00	2 502 219,50
Лот №56	Апартамент №803 (2-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1591. Назначение – нежилое. Этаж – 8. Площадь – 103,1 кв. м	16 305 476,00	1 630 547,60
Лот №57	Апартамент №809 (1-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1590. Назначение – нежилое. Этаж – 8. Площадь – 60,6 кв. м	9 389 213,00	938 921,30
Лот №58	Апартамент №810 (2-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1610. Назначение – нежилое. Этаж – 8. Площадь – 97,7 кв. м	14 216 605,00	1 421 660,50
Лот №59	Апартамент №811 (2-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1611. Назначение – нежилое. Этаж – 8. Площадь – 123,3 кв. м	17 941 735,00	1 794 173,50
Лот №60	Апартамент №901 (3-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1612. Назначение – нежилое. Этаж – 9. Площадь – 172,4 кв. м	25 242 076,00	2 524 207,60
Лот №61	Апартамент №902 (3-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1638. Назначение – нежилое. Этаж – 9. Площадь – 170,9 кв. м	25 022 195,00	2 502 219,50
Лот №64	Апартамент №907 (5-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1641. Назначение – нежилое. Этаж – 9, 10. Площадь – 347,2 кв. м	55 370 084,00	5 537 008,40
Лот №65	Апартамент №908 (5-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1648. Назначение – нежилое. Этаж – 9, 10. Площадь – 351,0 кв. м	51 643 526,00	5 164 352,60
Лот №66	Апартамент №1001 (5-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1659. Назначение – нежилое. Этаж – 10, 11. Площадь – 347,7 кв. м	51 158 074,00	5 115 807,40
Лот №67	Апартамент №1002 (5-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1651. Назначение – нежилое. Этаж – 10, 11. Площадь – 344,0 кв. м	50 614 082,00	5 061 408,20
Лот №68	Апартамент №1003 (2-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1663. Назначение – нежилое. Этаж – 10. Площадь – 103,1 кв. м	16 305 476,00	1 630 547,60
Лот №69	Апартамент №1004 (2-комнатный 2-уровневый) с кадастровым номером 23:49:0203004:1671. Назначение – нежилое. Этаж – 10, 11. Площадь – 139,0 кв. м	21 983 837,00	2 198 383,70
Лот №70	Апартамент №1009 (1-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1670. Назначение – нежилое. Этаж – 10. Площадь – 60,6 кв. м	9 389 213,00	938 921,30
Лот №71	Апартамент №1010 (2-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1672. Назначение – нежилое. Этаж – 10. Площадь – 97,7 кв. м	14 216 605,00	1 421 660,50
Лот №72	Апартамент №1011 (4-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1646. Назначение – нежилое. Этаж – 10, 11. Площадь – 247,4 кв. м	36 400 333,00	3 640 033,30
Лот №73	Апартамент №1101 (2-комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1647. Назначение – нежилое. Этаж – 11. Площадь – 108,3 кв. м	17 127 889,00	1 712 788,90
Лот №74	Гаражный бокс №1 с кадастровым номером 23:49:0203004:1649. Назначение – нежилое. Этаж – подвал № 3. Площадь – 14,9 кв. м	1 344 988,00	134 498,80
Лот №75	Гаражный бокс №2 с кадастровым номером 23:49:0203004:1673. Назначение – нежилое. Этаж – подвал № 3. Площадь – 14,5 кв. м	1 342 132,00	134 213,20
Лот №76	Гаражный бокс №3 с кадастровым номером 23:49:0203004:1618. Назначение – нежилое. Этаж – подвал № 3. Площадь – 14,0 кв. м	1 337 849,00	133 784,90
Лот №77	Гаражный бокс №4 с кадастровым номером 23:49:0203004:1650. Назначение – нежилое. Этаж – подвал № 3. Площадь – 12,7 кв. м	1 327 854,00	132 785,40
Лот №78	Гаражный бокс №5 с кадастровым номером 23:49:0203004:1652. Назначение – нежилое. Этаж – подвал № 3. Площадь – 13,9 кв. м	1 337 849,00	133 784,90
Лот №79	Гаражный бокс №6 с кадастровым номером 23:49:0203004:1654. Назначение – нежилое. Этаж – подвал № 3. Площадь – 12,7 кв. м	1 327 854,00	132 785,40
Лот №80	Гаражный бокс №7 с кадастровым номером 23:49:0203004:1596. Назначение – нежилое. Этаж – подвал № 3. Площадь – 13,2 кв. м	1 332 137,00	133 213,70
Лот №81	Гаражный бокс №8 с кадастровым номером 23:49:0203004:1601. Назначение – нежилое. Этаж – подвал № 3. Площадь – 12,8 кв. м	1 327 854,00	132 785,40
Лот №84	Гаражный бокс №11 с кадастровым номером 23:49:0203004:1607. Назначение – нежилое. Этаж – подвал № 3. Площадь – 13,4 кв. м	1 333 565,00	133 356,50
Лот №85	Гаражный бокс №12 с кадастровым номером 23:49:0203004:1598. Назначение – нежилое. Этаж – подвал № 3. Площадь – 11,3 кв. м	1 316 432,00	131 643,20
Лот №86	Гаражный бокс №13 с кадастровым номером 23:49:0203004:1604. Назначение – нежилое. Этаж – подвал № 3. Площадь – 14,9 кв. м	1 344 988,00	134 498,80
Лот №87	Гаражный бокс №14 с кадастровым номером 23:49:0203004:1605. Назначение – нежилое. Этаж – подвал № 3. Площадь – 12,5 кв. м	1 326 426,00	132 642,60
Лот №88	Гаражный бокс №15 с кадастровым номером 23:49:0203004:1608. Назначение – нежилое. Этаж – подвал № 3. Площадь – 12,5 кв. м	1 326 426,00	132 642,60
Лот №89	Гаражный бокс №16 с кадастровым номером 23:49:0203004:1606. Назначение – нежилое. Этаж – подвал № 3. Площадь – 13,1 кв. м	1 330 710,00	133 071,00
Лот №90	Гаражный бокс №17 с кадастровым номером 23:49:0203004:1614. Назначение – нежилое. Этаж – подвал № 3. Площадь – 11,7 кв. м	1 319 287,00

■ Увага, конкурс!

ЗДЫМІ СВАЁ ПАДАРОЖЖА НА ВІДЭА

«Звязда» выступае інфармацыйным партнёрам першага конкурсу аматарскіх турыстычных фільмаў «Падарожнічаем па Сінявокай»

Мы пастаянна расказваем пра тое, што абавязкова трэба ўбачыць у нашай краіне. Адкрываем Беларусь для іншаземцаў. Стараемся пісаць і пра малавядомыя куткі роднай зямлі, дзе будзе цікава пабываць. Цяпер мы прапануем нашым чытачам усяму свету паказаць самыя запамінальныя моманты сваіх падарожжаў.

Спаборніцтва для ўсіх

Конкурс праводзіцца ў першую чаргу для папулярызацыі ўнутранага турызму ў Беларусі.

— Яшчэ адна мэта — прыцягненне моладзі да актыўнага ладу жыцця. І, зразумела, добра, калі ўся сям'я адправіцца ў пешы паход, сплаў на байдарках, велавандроўку або аўтамабільную паездку! Трэба толькі падчас падарожжа здымаць на відэа і фатаграфаваць, — расказвае пра ідэю конкурсу яго аўтар **Дзмітрый ІЎЧАНКА, рэжысёр народнай кінастудыі «Летапіс» пры Талачынскім раённым цэнтры культуры і народнай творчасці.**

Арганізатары конкурсу «Падарожнічаем па Сінявокай»: аддзел ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Талачынскага райвыканкама і народная кінастудыя «Летапіс». У ім могуць удзельнічаць усе грамадзяне Беларусі, незалежна ад узросту.

— Чакаем і фільмы, створаныя ў турыстычных клубах і секцыях, гуртках, школах, самадзейных творчых калектывах, — дадае Дзмітрый.

Тэматыка павінна быць непасрэдна звязана з турызмам у Беларусі. Конкурсныя работы могуць быць выкананы ў жанры дакументальнага кіно, сацыяльнага кліпа (ролika), музычнага кліпа (ролika), слайд-фільма (слайд-шоу). Хранаметраж — да 20 хвілін. Агучваць фільм можна на рускай або беларускай мовах. А калі захочацца, і на замежнай, але такія работы павінны суправаджацца закадравым перакладам або субцітрамі на беларускай ці рускай мовах.

Паспець да сярэдзіны жніўня

Да 15 жніўня (уключна) можна адпраўляць працы на конкурс. Іх удзельнік можа падаць на разгляд неабмежаваную колькасць. Работу неабходна загрузіць на Youtube, а таксама выслаць заяўку-анкету на электронны адрас tolrmc@yandex.ru. Заяўку можна спампаваць па спасылцы http://kino.fotobel.by/?page_id=14. Там жа падрабязныя тлумачэнні пра ўмовы конкурсу.

Члены журы вызначаць пераможцаў да 15 верасня. А ўзнагароджванне пераможцаў адбудзецца 30 верасня ў Талачыне. Між іншым, «Звязда» таксама падрыхтавала фірменны прыз. Усе ўдзельнікі атрымаюць дыпломы. Звесткі аб аўтарах і самі фільмы будуць размешчаны на сайце конкурсу www.kino.fotobel.by. А на сайце «Звязды» можна будзе ўбачыць творы пераможцаў.

Аляксандр ПУКШАНСКІ. *pukshanski@zviazda.by*

■ На перадавой тэхналогій

ІНТЭЛЕКТУАЛЬНАЯ ЗБРОЯ,

або Чым здзіўляе айчынны ВПК

Штогод на Міжнародны выстаўцы ўзбраення і ваеннай тэхнікі «MILEX» колькасць экспанентаў з розных краін павялічваецца. Сёлета на адным з найбуйнейшых ва ўсходнееўрапейскім рэгіёне салоне ўзбраенняў сярод 350 ноу-хау ваеннага прызначэння вядучых сусветных кампаній былі прадстаўлены і распрацоўкі 80 беларускіх прадпрыемстваў.

Дзякуючы высокай якасці, надзейнасці і тэхнічным характарыстыкам, айчынная абаронная прадукцыя сёння складае канкурэнцыю замежным аналагам. Вось толькі некалькі армейскіх навінак, створаных таленавітымі беларускімі распрацоўшчыкамі.

1. Шматфункцыянальная браніраваная машына «Кайман». Беларускія браневікі паспяхова вытрымалі дзяржаўныя выпрабаванні і ўжо трапляюць на ўзбраенне нашай арміі. Машына ўпэўнена перамяшчаецца па моцна перасечанай мясцовасці. Па шашы «Кайман» рухаецца да 110 км/г, затое па грунтовых дарогах набірае хуткасць да 60 км/г. Як прызнаюцца распрацоўшчыкі, тэхніка прыдатная для бездарожжа. Больш таго, яна можа пераадолець і глыбокія водныя перашкоды — прычым без спецыяльнай падрыхтоўкі!

Аўтамабіль прызначаны для разведвальных і дыверсійных аперацый, можа выкарыстоўвацца падчас патрулявання і суправаджэння, правядзення міратворчых аперацый, дзеянняў ва ўмовах надзвычайных сітуацый. «Кайман» абсталяваны супрацьміннай абаронай. Дадатковай абаронай для экіпажа, які, дарэчы, складаецца з шасці чалавек, з'яўляюцца супрацьасколачныя маты, а таксама бакавыя дзверы транспартнага сродку: пры пасадцы або высадцы дэсанта яны выступаюць у якасці браніраванага шчыта, які ратуе ад франтальнага агню.

2. Аўтаматызаваны дыстанцыйна кіраваны назіральна-агнявы комплекс «АДУНОК» прызначаны для назірання і дыстанцыйнага кіравання сродкамі агнявога паражэння. Дзякуючы ўсталяванай аднайменнай рэактыўнай сістэме, баявыя магчымасці комплексу павялічваюцца за кошт двух тыпаў узбраення: стралковай зброі і рэактыўных гранат. Найбольш эфектыўны «АДУНОК» пры паражэнні лёгкабраніраванай і небраніраванай тэхнікі, агнявых сродкаў і жывой сілы праціўніка. Дыстанцыйнае кіраванне зброяй дазваляе захаваць асабовы склад за кошт адсутнасці непасрэднага кантакту з праціўнікам.

3. Партатыўны перадатчык перашкод «Граза-Р». Распрацоўка разлічана на барацьбу з мульцікоптарамі і малапамернымі беспілотнымі лятальнымі апаратамі, якія ўсё часцей выкарыстоўваюцца не ў самых лепшых мэтах. Пераносны перадатчык падаўляе радыёканалы кіравання беспілотнікамі і стварае перашкоды для сістэм спадарожнікавай навігацыі. Карыстальніку радыёэлектроннай зброі дастаткова навесці перадатчык на беспілотнік і ўключыць выпраменьванне, пасля чаго паветраны «парушальнік» спачатку страціць кіраванне, а потым выканае экстранную пасадку або ўвогуле ўпадзе.

4. Рабатызаваны супрацьтанкавы ракетны комплекс «Багамол» створаны на базе самаходнага дыстанцыйна кіраванага гусенічнага міні-шасі, здольнага перамяшчацца па перасечанай

мясцовасці. Баявой машынай па бесправадным канале сувязі кіруе аператар, які можа знаходзіцца на адлегласці да 300 метраў. Комплекс выкарыстоўваецца для паражэння ў аўтаматызаваным рэжыме ўмацаваных наземных цэляў, танкаў, бронемашын і завіслых верталётаў. Прычым кругласутачна!

5. Беспілотны лятальны апарат серыі «INDELA — I.N.SKY» мадыфікацыі BUR уяўляе сабой верталёт аднавінтавой схемы. Шасі ў им не прыбіраецца, ёсць дапаможнае крыло з дзвюма кропкамі падвескі баявой нагрузкі і рухавік унутранага згарання, які працуе на высокаактанавым бензіне. Комплекс авіёнікі, якім абсталяваны беспілотнік, у аўтаматычным рэжыме забяспечвае ўзлёт, палёт і пасадку, прычым з магчымасцю завісання над аб'ектам, каб выканаць пастаўленую задачу.

6. Лёгкабраніраваны аўтамабіль «Волат», створаны па заказе Міністэрства абароны, ужо прайшоў поўны цыкл выпрабаванняў, пераадолеўшы 40 кіламетраў, дэманструючы пры гэтым уражальныя характарыстыкі. Тэхніка, браніраваная па чацвёртым класе, развівае хуткасць да 110 км/г, з лёгкасцю пераадольвае водныя перашкоды глыбінёй да паўтара метра.

«Волат» прадугледжвае шматлікія варыянты камплектавання рухавікамі, электрыкай і тармазнымі сістэмамі. На базе шасі МЗКТ-4901 змацавана больш за пяць відаў комплексаў, прызначаных у тым ліку для патрэб Міністэрства ўнутраных спраў і сіл спецыяльных аперацый. Яшчэ адна з асаблівасцяў — установка на шасі гідрамеханічнай аўтаматычнай перадачы, якая не мае аналагаў на постсавецкай прасторы. Апошняя распрацоўка — таксама справа беларускіх майстроў. Яна ўжо серыйна ўсталёўваецца на машыны, прызначаныя для камплектавання як беларускай, так і расійскай арміі.

7. Мадэрнізаваны танк Т-72БМЭ адпавядае ўсім патрабаванням, якія прад'яўляюцца да сродкаў узброенага процiборства XXI стагоддзя. Характарыстыкі танка максімальна набліжаны да навейшых танкаў тыпу Т-90. Мадэрнізаваная тэхніка ўключыла ў сябе апошнія дасягненні ў галіне стварэння сістэм кіравання агнём, назірання і абароны ад сучасных сродкаў паражэння. На сучасным танку ўсталяваны новы прыцэльны комплекс з цеплавізійным прыцэлам, узмоцнена бранявая абарона, за кошт больш магутнага рухавіка павялічана яго рухомасць. Яшчэ адна з асаблівасцяў тэхнікі — аўтаномнасць пры вядзенні засадных і абарончых дзеянняў за кошт выкарыстання ўбудаванай аўтаномнай крыніцы харчавання.

Вераніка КАНЮТА.
kanyuta@zviazda.by

Фота прадстаўлены Дзяржваенпрамам

■ К@нтыненты

Крывавы праклён Афганістана

Ці ўдасца шматпакутнай краіне вярнуцца да мірнага жыцця?

На мінулым тыдні быў здзейснены адзін з самых крывавых тэрактаў у Афганістане з моманту звяржэння талібаў у 2001 годзе. Выбух магутнай бомбы, закладзенай у аўтацыстэрну для перавозкі вады, прагрымеў у апошні дзень вясны ў ранішні час пік, калі на вуліцах Кабула было шматлюдна. Аўтамабіль падарвалі на КПП, які вядзе ў дыпламатычны квартал сталіцы Афганістана, непадалёк — прэзідэнцкі палац. Выбух быў такой магутнасці, што «страсянуў» значную частку Кабула, і яго жыхары спачатку падумалі пра землятрус. У горадзе пачалася паніка. Ахвярамі тэракта сталі не толькі мясцовыя жыхары, але і замежныя дыпламаты — усяго загінула 150 чалавек. Пацярпелі шматлікія будынкі, у прыватнасці пасольствы Францыі, Германіі, Чэхіі, Ірана, Турцыі, Егіпта, ААЭ. Пры гэтым тэракты ў краіне здараюцца ледзь не штодня. «Тэрарысты нават у святы месяц рамадан, у месяц дабрыні, літасці і малітвы, не перастаюць забіваць нявінных людзей», — заявіў прэзідэнт Афганістана Ашраф Гані. Ці ёсць шанц у шматпакутнай краіны выкараскацца з крывавай багны вайны?

ЗА МЯЖОЙ КАНТРОЛЮ

Афганістан знаходзіцца на перакрыжаванні паміж Усходам і Захадам і з'яўляецца старажытным цэнтрам гандлю і міграцыі. Ён размяшчаецца паміж Паўднёвай і Цэнтральнай Азіяй, з аднаго боку, і Блізкім Усходам — з другога, што дазваляе яму адыгрываць важную ролю ў эканамічных, палітычных і культурных адносінах паміж краінамі рэгіёна. Нездарма гэтая стратэгічная тэрыторыя заўжды прыцягвала да сябе ўвагу і з'яўлялася «смачным кавалачкам» для сусветных гульцоў. На жаль, цягам дзесяцігоддзяў стабільнасці тут не назіралася. Сітуацыя ў Афганістане ў апошнія тыдні імкліва дэградуе. Цэнтральная ўлада ў Кабуле паслядоўна губляе кантроль у правінцыях краіны, аддаючы яе ў рукі баевікоў «Ісламскай дзяржавы» і «Талібана». Асабліва прыкметная гэтая тэндэнцыя на поўначы Афганістана, што мяжуе з дзяржавамі Сярэдняй Азіі.

Ваенная прысутнасць ЗША і НАТА не здольная забяспечыць належны ўзровень бяспекі нават у месцах дыслакацыі іх кантынгентаў. Як сцвярджаюць аналітыкі, навучанне і падрыхтоўка Афганскай нацыянальнай арміі (АНА) і паліцыі, якімі займаюцца амерыканцы і еўрапейцы, так і не падняліпрафесійны ўзровень уладавых узброеных сіл, іх раз'ядае карупцыя, што трагічна ў прамым сэнсе падрывае спакой у краіне. Праблемы ўзмацняюцца так і не вырашанымі супярэчнасцямі ўнутры самога кіруючага рэжыму на чале з прэзідэнтам Ашрафам Гані і прэм'ер-міністрам Абдулой Абдулой.

Агульная колькасць людзей, вымушаных пакінуць свае дамы, вырасла амаль да 2 мільёнаў чалавек, адзначаецца ў дакладзе Упраўлення ААН па каардынацыі гуманітарных пытанняў. Пры гэтым колькасць узброеных сутыкненняў паміж урадавымі войскамі і ісламістамі летась рэзка павялічылася. У параўнанні з 2015 годам прырост склаў 22%, што з'яўляецца самым высокім вынікам за ўвесь час аналізу сітуацыі ААН (цягам апошняга дзесяцігоддзя).

Як адзначае газета The New York Times, «працэс стабілізацыі ў краіне сутыкаецца з сур'ёзнымі цяжкасцямі», хоць ваенны канфлікт у Афганістане з удзелам ЗША працягваецца ўжо больш за 15 гадоў, а аб'ём замежнай дапамогі, выдаткаванай для рэспублікі, складае ўжо мільярды долараў. Выданне канстатуе, што «сітуацыя ў сферы бяспекі ў Афганістане паслядоўна пагаршалася з 2014 года». Паводле ацэнак генеральнага інспектара ўрада ЗША па пытаннях рэканструкцыі ў Афганістане Джона Сопка, улады краіны ў лістападзе 2015 года ўтрымлівалі пад поўным кантролем 72% яе тэрыторыі, а да лістапада 2016 года гэты паказчык скараціўся да 57%.

ФАКТАР «ТАЛІБАНА»

«Талібы з'яўляюцца найбольш сур'ёзнай пагрозай для афганскага ўрада, яны больш шматлікія, лепш арганізаваныя, валодаюць вялікімі сувязямі і ўплывам у краіне, а таксама маюць больш трывалую палітычную структуру», — адзначае CNN. Як заўважае тэлеканал, за апошнія шэсць месяцаў «Талібан» умацаваў свае пазіцыі, у прыватнасці, у правінцыях Кундуз на поўначы Афганістана і Гільменд на поўдні. Паводле звестак CNN, у Афганістане цяпер дзейнічаюць прыкладна 35 тыс. баевікоў руху «Талібан».

«Талібан» узнік у 1994 годзе ў разгар грамадзянскай вайны ў Афганістане. Асноваруху сталі радыкальныя ісламскія прапаведнікі і ветэраны супраціўлення савецкім войскам у 1980-я, у першую чаргу з ліку пуштунаў, якія насяляюць поўдзень

краіны. Талібы кіравалі Афганістанам з 1996 па 2001 год — да пачатку аперацыі НАТА, абвясціўшы ў краіне «Ісламскі эмірат Афганістан» (ІЭА). Гэты рэжым прадугледжваў істотныя абмежаванні грамадзянскіх і асабістых свабод: забараняліся тэлебачанне, кіно і музыка, значна ўшчамляліся правы жанчын, практыкаваліся публічныя пакаранні смерцю. Тым не менш ІЭА быў на дыпламатычным узроўні прызнаны трыма дзяржавамі: Аб'яднанымі Арабскімі Эміратамі, Пакістанам і Саудаўскай Аравіяй.

Пасля звяржэння ў Кабуле талібы сышлі ў горы і пачалі партызанскую вайну. Многія перабраліся ў суседні Пакістан. Да 2003-га рух талібаў актывізаваўся, у той жа год Савет Бяспекі ААН прызнаў яго тэрарыстычным. Ужо ў 2005-м ім удалося зноў стварыць сваю дзяржаву на паўночным захадзе Пакістана. У 2007 годзе «Талібан» у той ці іншай ступені быў прадстаўлены больш чым на палове тэрыторыі Афганістана.

Баевікі гэтай тэрарыстычнай групоўкі збіраюць з насельніцтва падкантрольных тэрыторый плату за электраэнергію, якая даецца ўладамі Афганістана, паведамляе выданне New York Times. У некаторых раёнах

тэрарысты патрабуюць плату раз у год, у іншых — штомесяц. Акрамя выплат за электраэнергію, групоўка таксама збірае падаткі з уладальнікаў млыноў і бульбяных палеткаў, з настаўнікаў, а таксама спаганяе пошліны за праезд праз свае блокпасты грузавікоў з гароднінай, аўтацыстэрнаў і за правядзенне вясельных цырымоній.

Даклад ААН аб сітуацыі ў Афганістане сведчыць, што баевікі «Талібана» імкнуцца разнастаіць крыніцы грашовых паступленняў. Падаткі з мясцовага насельніцтва становяцца адным з альтэрнатыўных спосабаў здабычы сродкаў, аднак асноўны аб'ём фінансавання па-ранейшаму прыпадае на даходы ад нелегальнай здабычы карысных выкапняў, наркагандлю і дапамогу замежных спонсараў. Сітуацыя ў Афганістане ў апошнія месяцы прыкметна пагоршылася. Рух «Талібан», які раней ахапіў значную тэрыторыю ў сельскіх раёнах краіны, разгарнуў наступленне на буйныя гарады. Акрамя таго, баевікі спрабуюць

асядлаць найбуйнейшыя транспартныя артэрыі краіны. Інтэнсіфікацыя ўзброенай барацьбы, якую вядуць талібы, цесна звязаная з крызісам у кіраўніцтве краінай. Як заўважаюць эксперты, «Талібан» цяпер значна больш кансалідаваны, чым урад у Кабуле. Агульнае паслабленне ўрадавага кантролю над тэрыторыяй робіць больш частымі ваенныя няўдачы рэжыму.

ПА ШЛЯХУ ДЖЫХАДУ

Таксама на тэрыторыі краіны актывізавалася тэрарыстычная групоўка «Ісламская дзяржава». Большасць з баевікоў не афганцы, а замежнікі, у тым ліку з краін Цэнтральнай Азіі, якія набылі баявы вопыт у Сірыі і Іраку. «Ісламская дзяржава» пачала актыўна распаўсюджвацца на ўсходзе Афганістана ўжо пазалетась. У гэтай краіне перадавым атрадам ІД стала групоўка «Вілаят Харасан». Перш за ўсё гаворка ідзе пра меркаваную тэрыторыю, якая ўключае Афганістан, Пакістан і ўсе краіны Цэнтральнай Азіі. Заснавальнікам групоўкі стаў адзін з аўтарытэтных камандзіраў пакістанскага «Талібана» Хафіз Саід Хан. На пачатку 2010-х гадоў, пасля таго як амерыканцы знішчылі некалькі лідараў руху, сярод баевікоў узніклі кадравыя спрэчкі. Хан уваходзіў у кіраўніцтва і прэтэндаваў на лідарства, аднак іншыя члены пакістанскага «Талібана» яго не падтрымалі. Пасля гэтага ў 2015 годзе палявы камандзір прысягнуў на вернасць Абу Бакр аль-Багдадзі. У ліпені 2016-га ВВС са спасылкай на крыніцу ў Пентагоне паведамляла, што Хафіз Саід Хан забіты, але рух працягваў набіраць абароты.

Цяпер асноўны касцяк «Вілаят Харасан» — колішнія талібы з ліку пуштунаў, а таксама замежнікі з краін СНД. Апорай новай структуры джыхадзістаў сталі правінцыі Кунар і Нангархар, якія зручныя і ў сілу свайго геаграфічнага становішча. Побач знаходзіцца Ваханскі калідор — вузкая стужка суровай высакагорнай тэрыторыі Афганістана паміж Таджыкістанам, Кітаем і Пакістанам. Праз яго яшчэ падчас вайны з прасавецкім урадам у Кабуле мяцежнікі атрымлівалі падтрымку зброяй і добраахвотнікамі.

Цяпер апетыты «Ісламскай дзяржавы» растуць: джыхадзісты пачалі «распаўзацца» па тэрыторыі ўсёй краіны, адзначаюць эксперты. Пачасціліся сутыкненні паміж «Талібанам» і ІД. Бакі не раз аб'яўлялі джыхад адзін аднаму. Прынамсі, пра гэта са спасылкай на кіраўніка ўпраўлення паліцыі правінцыі Гельменд (поўдзень Афганістана) Набі Джана Мулахейла паведамляла пакістанскае радыё Mashaal. У першую чаргу баевікі спрабуюць падзяліць паміж сабой плантацыі опіюмнага маку. Другая прычына, па якой паміж групоўкамі ўзнікаюць рознагалоссі, — чалавечыя рэсурсы. «Афганістан — краіна маладых: 80% насельніцтва — гэта людзі да 30 гадоў. Таму прапаганда для ІД — вельмі важная рэч. З яе дапамогай джыхадзісты прыцягваюць да сябе моладзь», — кажа эксперт Цэнтра вывучэння сучаснага Афганістана Андрэй Серэнка.

Пакуль талібы кантралююць большую тэрыторыю, чым «Ісламская дзяржава», але асноўная задача новага пакалення джыхадзістаў — максімальна ўжыцца ў мясцовае грамадства і ўмацаваць свой уплыў. «Без патрэбы яны не канфліктуюць з талібамі, часам нават не нападаюць на афганскіх вайскоўцаў без неабходнасці», — адзначыў эксперт. Ён таксама распавёў, што апошнім часам было зафіксавана актыўнае пашырэнне ІД менавіта на поўнач — да меж з Туркменістанам і Узбекістанам.

«Сёння распаўсюджванне «Ісламскай дзяржавы» не абмяжоўваецца Сірыяй і Іракам, — падкрэсліў міністр абароны Расіі Сяргей Шайгу. — Бандфарміраванні ісламістаў дзейнічаюць у Афганістане, які мае статус дзяржавы — назіральніка ў ШАС». Шайгу нагадаў пра тое, што цяпер колькасць атрадаў ІД на афганскай тэрыторыі дасягае 3,5 тысячы чалавек, і экспансіўная дзейнасць групоўкі ўяўляе пагрозу ў тым ліку і для суседзяў Афганістана.

«ПУГА» НЕ ДАПАМОЖА

Афіцыйна місія НАТА ў Афганістане завяршылася ў 2014 годзе. Цяпер там засталося 8,4 тыс. амерыканскіх і 6 тыс. вайскоўцаў з іншых краін. Афіцыйна яны навучаюць афганскіх калег. Яшчэ 29 тыс. прыватных падрадчыкаў Пентагона выкарыстоўваюцца ў якасці персаналу службы бяспекі і выконваюць розныя дапаможныя місіі. 25 мая на саміце НАТА абмяркоўвалася пытанне аб накіраванні ў Афганістан дадатковага кантынгенту войскаў. Як заявіў генеральны сакратар альянсу Енс Столтэнберг, гэта не азначае вяртання да ўдзелу ў баявых дзеяннях. У выпадку прыняцця станоўчага рашэння яны будуць аказваць дапамогу ў навучанні афганскай арміі і кансультаваць камандзіраў па арганізацыі баявых дзеянняў.

Камандуючы сіламі ЗША і НАТА ў Афганістане генерал Джон Нікалсан на слуханнях у камітэце па справах узброеных сіл Сената Кангрэса ЗША ў лютым гэтага года ахарактарызаваў сітуацыю ў рэспубліцы як «патавую». Ён заўважыў, што ў краіну патрабуецца накіраваць некалькі тысяч амерыканскіх вайскоўцаў. Па словах генерала, гэта дазволіць толькі захаваць ранейшае становішча рэчаў і пазбегнуць сур'ёзнага аслаблення ўрада, а не нанесці паражэнне талібам. Па паведамленнях амерыканскіх СМІ, Вашынгтон разглядае пытанне аб накіраванні да 5 тыс. вайскоўцаў, уключаючы сілы спецыяльных аперацый.

Зрэшты, з 2001 года, калі амерыканцы пачалі аперацыю ў Афганістане, прыкметных поспехаў дасягнута так і не было. Хутчэй, усё больш назіраліся правалы. Напрыклад, звязаныя з ростам вытворчасці наркотыкаў. Расійскі палітолаг Ігар Хахлоў упэўнены, што з'яўленне амерыканцаў у Афганістане паспрыяла таму, што ў краіне вырабляюць гераін у прамысловым маштабе. Пра гэта эксперт заявіў у праграме «Тэорыя змовы» на тэлеканале «Звезда». Як лічаць эксперты, вырошчваннем сельскагаспадарчых культур, якія выкарыстоўваюцца ў якасці сыравіны для наркотыкаў, у краіне занятыя больш земляў, чым у Калумбіі, Балівіі і Перу разам узятых. «Вытворчасць гераіну павялічылася ў тысячы разоў. Прычым вытворчасць у Афганістане зараз настолькі маштабная, што там наладжаны вельмі магутныя лагістычныя ланцужкі па пастаўцы прэкурсораў. Справа ў тым, што для вытворчасці гераіну недастаткова мець опій. Патрабуецца вялікая колькасць прэкурсораў — хімічных рэчываў», — заўважыў палітолаг. Пры гэтым, на думку Хахлова, ЗША разглядаюць наркотык як таран, пры дапамозе якога яны дэстабілізуюць сітуацыю ў Еўразіі.

2016-ты стаў для Афганістана, па словах прэзідэнта Гані, «годам выжывання». І сёлета справы зусім не наладзіліся. Сітуацыя ў Афганістане пагаршаецца, заявіў Сяргей Шайгу. «Ваенная аперацыя міжнароднай кааліцыі на чале з ЗША, на жаль, спакою туды не прынесла», — адзначыў міністр. Расце рызыка таго, што рэжым у Кабуле можа абрынуцца з-за цяжкага эканамічнага крызісу, стварэння паралельнага ўрада ці дзяржаўнага перавароту. Аднак у прапанаваным амерыканцамі плане стаўка зноў робіцца на супакаенне Афганістана з дапамогай ваеннай сілы. Большасць заходніх спецыялістаў лічыць, што накіраванне дадатковага кантынгенту войскаў у Афганістан не вырашыць праблему. Спыніць гвалт у краіне могуць толькі самі афганцы. Ніякая трэцяя сіла за іх не здольная гэта зрабіць. Што, дарэчы, пацвердзіла міжнародная канферэнцыя па ўрэгуляванні сітуацыі ў Афганістане, якая адбылася днямі ў Кабуле. Удзел у ёй узялі прадстаўнікі больш чым 20 краін. Як заўважаюць аналітыкі, нацыянальнае прымірэнне павінна ўключаць больш шырокі спектр сацыяльных і палітычных груп. Захаванне сітуацыі, пры якой зацікаўленымі бакамі міжафганскага канфлікту прызнаюцца толькі ўрад Гані і кіраўніцтва талібаў, не дае рашэння праблемы.

Захар БУРАК.
burak@zviazda.by

Наш культурны асяродак
Жырандоля
Выпуск №22 (369)

НА МОВЕ ЦЕЛА І ДУШЫ

Баланс вонкавага і ўнутранага свету даследуюць на тэатральнай сцэне

Амаль год, як у Беларусі з'явіўся новы прававацыйны тэатральны праект «HomoCosmos». Праект мае на мэце стварыць адкрыты сцэнічны дыялог на актуальныя, але табуіраваныя тэмы, шчыра звяртаецца да спалучэння духоўнага і цялеснага ў чалавеку. Пастаўленыя ў межах праекта спектаклі «Камера, якую дала мне маці» і «Бог казытання» (будзе паказаны 14 чэрвеня) выклікалі шмат дыскусій. Пра нараджэнне ініцыятывы, дасягненні і далейшыя планы «HomoCosmos» расказала суаўтар і прадзюсар праекта Кацярына САЛАДУХА.

— Насамрэч, калі ўсё пачалося, ні аб якім паўнавартасным праекце гаворка не ішла. Спачатку быў... спектакль! У польскага рэжысёра і цяпер ужо партнёра па праекце Дарыюша Язерскага сем гадоў таму на міжнародным фестывалі «Тэатральны куфар» нарадзілася ідэя паставіць у Мінску спектакль «Камера, якую дала мне маці» паводле прозы Сюзанны Кейсан (пісьменніца вядомая па рамане і аднайменным кінафільме «Перапыненае жыццё»). Яшчэ тады пачалі абмяркоўваць, хто будзе рабіць пераклад, якім чынам усё арганізаваць. Аднак шлях ад задумы да рэалізацыі атрымаўся доўгі: мы абвясцілі кастынг толькі ў канцы 2015 года. У выніку сабралі больш за 90 заявак. На думку рэжысёра, лепш за ўсіх падыходзіла Настасся Баброва — актрыса Рэспубліканскага тэатра беларускай драматургіі. Ён не памыліўся: галоўную ролю ў манадраме «Камера, якую дала мне маці» так пранікнёна выканаць магла толькі Настасся. Калі ў верасні 2016 года надышоў час прэзентаваць дзею гледачу, зразумелі, што не хочам выпускаць спектакль у культурную прастору без дакладнага вызначэння яго скіраванасці ды мэты. Тады мы наважыліся перайсці ад адной пастаноўкі да паўнавартаснага тэатральнага праекта «HomoCosmos».

— Што зроблена за час існавання праекта?

— Зараз мы падсумоўваем вынікі першага сезона. На працягу рэалізацыі «HomoCosmos» адбыліся дзве пастаноўкі: нядрэнна для ініцыятывы, якая існуе менш за год. Яшчэ адно наша дасягненне — праект на слыху. На думку крытыкаў, журналістаў і блогераў, манадрама «Камера, якую дала мне маці» ўвайшла ў топ-10 найлепшых беларускіх спектакляў і ў спіс самых цікавых пастановак 2016 года, паказаных ў Беларусі, а таксама прымерыла на сябе званне найскандальнейшага спектакля сезона. Нягледзячы на тое, што «Камера, якую дала мне маці» — сур'ёзнае даследаванне на актуальную і нават «балючую» для грамадства тэму, пастаноўка выглядае, як эксперымент: так адкрыта пра сувязь духоўнасці і сексуальнасці на сцэне рэдка кажуць.

Галоўнае, што «HomoCosmos» не абмежаваны адной ці дзвюма пастаноўкамі — тэматыка праекта дастаткова шырокая і спрыяе новым ідэям. Ужо ёсць задумы для наступных спектакляў, а таксама планы на пашырэнне праекта да паўнавартаснай тэатральнай платформы з адукацыйнымі мерапрыемствамі, практычнымі трэнінгамі, выстаўкамі.

— Якім чынам адбываецца падбор спектакляў для «HomoCosmos»?

— Перад прыняццем канчатковага рашэння дасканала абмяркоўваем п'есы з рэжысёрам. «Бог казытання» чакаў выхаду да гледача амаль тры гады: крыху менш за «Камеру...», але ўсё ж досыць доўга. Абодва спектаклі адпавядаюць тэме праекта і раскрываюць тыя ці іншыя аспекты цялеснасці. Можна спрачацца аб тым, закранаем мы ў пастаноўках табуіраваныя пытанні ці не, але сумніўна, што такія рэчы маглі б з'явіцца ў якім-небудзь дзяржаўным тэатры.

— Ці складана знаходзіць пляцоўкі для паказаў, падбіраць акцёраў на ролі?

— На шчасце, заказваць пляцоўкі для спектакляў было досыць лёгка. Мы вельмі ўдзячныя Нацыянальнаму цэнтру сучасных мастацтваў, які хутка пагадзіўся стаць партнёрам для першай пастаноўкі. На наш погляд, «Камера...» ідэальна ўпісалася ў іх невялікі блэкбокс. Для «Бога казытання» была патрэбна пляцоўка большая ды святлейшая за папярэднюю. Нам пашанцавала: у канцы зімы адкрылася новая прастора «Сталоўка XYZ» на Фабрыцыуса, якая пасавала задуме спектакля. Тут варта сказаць вялікі дзякуй менеджарам пляцоўкі: яны стварылі вельмі спрыяльныя для творчага працэсу ўмовы, а прастора «Сталоўкі» вызначыла форму і сцэнаграфію пастаноўкі.

З пошукам акцёраў для «Бога казытання» было нялоўка. Складанасць надавалі і занятасць акцёраў у вясновы перыяд, і тэма спектакля. Мы былі вымушаныя рабіць замены нават у працэсе пастаноўкі. За 10 дзён да прэм'еры ў экстрэмальна кароткія тэрміны ў спектакль быў уведзены Дзмітрый Ягораў — сапраўдная знаходка для ролі і проста цудоўны акцёр. Наогул, трэба адзначыць усіх акцёраў, якія бяруць удзел у праекце «HomoCosmos»: яны смела ўключаюцца ў эксперымент і атрымліваюць асалоду ад сваёй справы.

— Як, на ваш погляд, гледачы ўспрынялі спектаклі «Камера, якую дала мне маці» і «Бог казытання»?

— Вельмі эмацыйна! Рэакцыя атрымалася досыць супярэчлівая: анонс першага спектакля напаткаў мноства папрокаў (па прынцыпе «не глядзеў, але асуджаю»), а пасля прагляду мы атрымалі шмат добрых водгукаў. Безумоўна, камусьці падабаецца, камусьці — не, але абыякавасці няма. Неад'емнай часткай нашага праекта з'яўляецца дыскусія пасля кожнага спектакля, дзе гледачы адкрыта выказваюць свае меркаванні і аб якасці мастацкай работы, і аб тэме п'есы. Падчас такіх дыскусій часта нараджаюцца новыя сэнсы.

Дар'я ЧАРНЯЎСКАЯ.

Падчас спектакля «Камера, якую дала мне маці». Фота Хрысціны ГРЭЖАВАЙ.

■ Спадчына

Коласаў скарб

Мясціны Якуба Коласа напоўненыя жыццём і сённяшнім. Яны ззяюць хараством летняй, квітнеючай прыроды. Яны захоўваюць традыцыі народнай культуры. Яны самой сваёй атмасферай заспакойваюць, натхняюць на роздум — і дзесьці ўнутры абуджаецца прага да родных песень, да добрых беларускіх вершаў... 8-га чэрвеня споўнілася 50 гадоў з дня адкрыцця філіяла музея Якуба Коласа «Мікалаеўшчына», што ў Стаўбцоўскім раёне. Шаноўная дэлегацыя дзеячаў культуры, кіраўнікоў музеяў, іншых неабыякавых людзей, шчыра ўлюбёных у паэтычнае слова Якуба Коласа, наведала радзіму песняра, каб дакрануцца да яго вытокаў і аддаць належную даніну памяці.

Школьнікі Мікалаеўшчыны сустракаюць дырэктара музея Якуба Коласа Зінаіду КАМАРОЎСКУЮ.

Дзякуючы клопату старэйшага сына Якуба Коласа Данілы Міцкевіча, першага дырэктара музея паэта ў Мінску, і яго наступнікаў Георгія Ткацэвіча і Зінаіды Камароўскай, былі адноўлены і музеефікаваны сядзібы Акінчыцы, Альбуць, Смольня, Ласток. У свой час яны былі аб'яднаны ў Коласаўскі мемарыяльны заказнік,

Дырэктар Нацыянальнага мастацкага музея Уладзімір ПРАКАПЦОЎ *(злева)* прапануе ўнесці драўляныя скульптуры ў спіс гісторыка-культурнай спадчыны. Разам з ім разьбяр Сяргей КЛЯШЧУК.

што сёння прадстаўляе мясціны Стаўбцоўскага краю, звязаныя з імем паэта.

— Хтосьці сказаў, што жыццё пражыць — гэта як прайсці ад хаты да хлява. Таму 50 гадоў — гэта зусім нямнога, — заўважыла **дырэктар Дзяржаўнага літаратурна-мемарыяльнага музея Якуба Коласа Зінаіда КАМАРОЎСКАЯ.** — Час бяжыць вельмі хутка. Але застаецца памяць пра людзей, якія зрабілі вялікі ўнёсак ва ўшанаванне і захаванне сваіх мясцін, якія прывівалі любоў наступным пакаленням да свайго, роднага. Таму вялікую справу зрабіў Якуб Колас... Калі б не яго шчырасць, адданасць, мы б не наведвалі сёння яго сядзібы. Але я вельмі ўдзячна і ўсім рупліўцам спадчыны Коласа — гэта Марыя Міцкевіч, Яўгенія Міцкевіч, Алена Зернічэнка, Георгій Міцкевіч і многія іншыя, дзякуючы каму памяць пра паэта ашчадна захоўваецца.

Варта адзначыць, што сядзібы звязаны паміж сабой мастацкім комплексам драўляных скульптур «Шлях Коласа», створаным па ініцыятыве Стаўбцоўскага райвыканкама і музея Якуба Коласа ў 1990—1992 гадах. Сёння іх аднаўленнем і рэстаўрацыяй займаецца разьбяр Сяргей Кляшчук.

— Я з вялікай радасцю адкінуў усе клопаты і прыехаў на святкаванне юбілею Коласавых мясцін, бо мне тут надзвычай хораша, — адзначыў **старшыня Саюза мастакоў Рыгор СІТНІЦА,** які таксама прысутнічаў на ўрачыстасці. — Самы галоўны Коласаў скарб, які ён нам пакінуў, — гэта наша мова. Трэба задумацца, ці належным чынам мы абыходзімся з гэтым скарбам? Мы павінны памятаць, што ў апошні дзень жыцця пясняр занёс у ЦК КПБ ліст, у якім выказаў свае хваляванні пра стан роднай мовы. Але гэта было ў той час — а ці палепшылі мы нешта сёння, пасля Коласавага адыходу?.. Таму асноўная задача — каб нашы нашчадкі прыходзілі сюды, на Стаўбцоўшчыну, каб ведалі волата Бацькаўшчыны. Кожны з нас мусіць прыцягнуць да справы яшчэ некалькі чалавек, і тады будзе бачны вынік. Віншую ўсіх рупліўцаў, што шчыруюць над паэтавай спадчынай. Ад імя мастакоў гарантую падтрымку ўсім праектам, звязаным з Якубам Коласам і яго творчай спадчынай.

Падаецца, Стаўбцоўшчыну сапраўды варта наведаць, нават не ў юбілейны час. Каб лепш зразумець песняра. Каб па-новаму адкрыць для сябе харство Беларусі.

Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ, Анатоль КЛЯШЧУК (фота).
Стаўбцоўскі раён

Больш здымкаў глядзіце на сайце www.zviazda.by.

■ Запрашальнік

НА СВЯТА — У ПАСТАВЫ

Учора, 9 чэрвеня, у Паставах распачаўся XX Міжнародны фестываль народнай музыкі «Звіняць цымбалы і гармонік».

На працягу трохдзённага фестывальнага марафону ў адным з самых прыгожых райцэнтраў краіны граюць, спяваюць, танцуюць, забаўляюць, гандлююць. Фэст даўно ўжо стаў візітнай карткай краю. Сёлета ў ім бяруць удзел прадстаўнікі каля дзясятка краін.

У першы дзень культурнага праекта прайшло літаратурна-музычнае свята «Душой народжанае слова». Адбыўся таксама канцэрт калектываў мастацкай самадзейнасці «Карагод народных талентаў», а на гарадскім стадыёне — спартыўныя спаборніцтвы.

У суботняй праграме — адкрыццё мемарыяльнай дошкі, прысвечанай акцёрам-землякам Станіславу Ясюковічу і Зыгмунту Кенстовічу. Запрацуе і выстаўка, прысвечаная знакамітым навукоўцам — ураджэнцам Пастаўшчыны. Гэтае мерапрыемства прысвечанае аб'яўленаму ў краіне Году навукі. Адбудзецца прэзентацыя кнігі «Беларускія народныя музычныя інструменты».

Заўсёды шмат удзельнікаў і гледачоў збірае конкурс калектываў і «сола»-выканаўцаў на народных інструментах «Хто каго?». Вялікі інтарэс у гасцей выклікае і конкурс сельскіх падворкаў «Пастаўшчына гасцінная». Каля палаца Тызенгаўзаў на вечар запланавана традыцыйнае ўнікальнае тэатралізаванае прадстаўленне «Музыка беларускіх палацаў і сядзіб». Пасля гэтага ўрачыста адкрыюць фестываль. А пасля феерверку найлепшыя дыджэі пакажуць клас.

У апошні дзень фестывалю адбудуцца канцэрт беларускай класічнай музыкі, канцэрт ваеннага духавога аркестра, тэатралізаванае шэсце і заключны гала-канцэрт з удзелам ансамбля салістаў Нацыянальнага акадэмічнага народнага аркестра Рэспублікі Беларусь імя І. Жыновіча.

Аляксандр ПУКШАНСКІ. *pukshanski@zviazda.by*

...ТАКСАМА ЁСЦЬ ДЖАЗ!

Ужо сёння ў сталічным Верхнім горадзе пройдзе адзін з канцэртаў «Джазавых вечароў з банкам БелВЭБ». У 20 гадзін тут можна будзе пачуць і ўбачыць легендарнага Харысана Янга з Нідэрландаў, а таксама трыа Скота Хэндэрсана з Францыі. Не застануцца ўбаку і беларускія музыканты: выступіць VIP-JAZZ Андрэя Славінскага і этна-джаз дуэт Agata. Аднак гэта толькі прыемны пачатак: кожную суботу ў чэрвені, у той жа час на тым жа месцы можна будзе пачуць добры джаз.

— Асноўны складнік джаза — імправізацыйныя мелодыі, якія ў гэтым жанры нараджаюцца літаральна на сцэне, у момант выканання перад публікай, — расказаў **музычны прадзюсар фестывалю Алег КАЛІНА.** — Галоўным крытэрыем запрашэння музыкантаў на гэты фестываль з'яўляецца іх здольнасць добра імправізаваць. Таксама магчымасць іх выступлення ў Мінску: мы ганарымся тым, што змаглі скаардынаваць прыезд артыстаў, якія жывуць на іншым баку зямнога шара, і запрасілі музыкантаў, якія знаходзяцца ў летнім еўрапейскім турнэ. Публіка на гэтыя вечары прыходзіць розная — і падрыхтаваная, сапраўдныя прыхільнікі джазу, і не, выпадковыя людзі. Мы пастараліся ўлічыць усе густы. Будуць гучаць і вядомыя джазаваныя стандарты ў выкананні беларускіх музыкаў і замежных гасцей. Безумоўна, будзе выканана аўтарская музыка, умоўна вельмі эстэцкая. Будуць калектывы розныя па колькасці ўдзельнікаў: ад дуэта, трыа, квартэта да біг-бэнда. Адным словам, ці застаняцеся задаволенымі, меркаваць вам.

17 чэрвеня ў Мінск завітае Крысціян Галвез, а таксама Крысціян Куцюруфо з Чылі. Беларусь прадставіць Трыа Канстанціна Гарачага (у складзе Канстанціна Гарачага, Вячаслава Сяргеенкі, Назара Рэджэпава) і біг-бэнд пад кіраўніцтвам Барыса Мягкова. Сёлета вырашылі ўключыць у праграму як мага больш джазавых дасягненняў айчынных музыкаў, бо джаз у Беларусі мае дастаткова глыбокія карані — ім амаль стагоддзе.

Спецыяльнай госцяй джазавых вечароў стане Сафія Курловіч, 7-гадовая джазавая піяністка з Салігорска. Яна з'яўляецца пераможцам двух конкурсаў, часта выступае за мяжой, аднак беларускай публіцы дагэтуль была амаль невядома. **Выкладчыца Святлана ПЯТРОВІЧ,** якая займаецца з Сафіяй, запэўніла:

— У Салігорску таксама ёсць джаз. Маем нават уласны конкурс «Jazz-time», з якога і пачаўся творчы шлях Сафіі Курловіч. Там яна атрымала першую перамогу, тады ёй было 6 гадоў. Мінулы год стаў для дзяўчынкі надзвычай плённым: мы вельмі шмат бывалі ў Маскве, выступалі з вядомымі музыкантамі, у самых папулярных залах. Цяпер Сафія з'яўляецца ўдзельніцай тэлевізійнага конкурсу «Сіняя птушка» на тэлеканале РТР.

Гэты год у многім адметны для беларускай музыкі. Сёлета споўнілася 40 гадоў самаму вядомаму беларускаму джазаваму калектыву, адзінаму, якія мае Гран-пры міжнароднага конкурсу, — гэта ансамбль традыцыйнага джаза «Рэнесанс». Відаць, гэты юбілей таксама не застанецца па-за ўвагай сталічнай публікі.

Васіль ПАЛОНСКІ, прадстаўнік банка БелВЭБ, які з'яўляецца спонсарам джазавых вечароў, адзначыў, што пяць гадоў існавання праекта паказалі, што ў гэтага мастацтва шматтысячная аўдыторыя, і арганізатары робяць усё, каб жыхары і госці сталіцы мелі магчымасць добра праводзіць суботнія вечары.

24 чэрвеня ў Верхнім горадзе выступяць Кліў Джонс з ЗША і Набіль Хемір з Туніса. Нашу краіну прадставяць вакальны квартэт Minsk Voisec і калектыў Premier Orchestra.

Пра яшчэ адзін цікавы музычны кірунак карэспандэнту «Звязды» расказаў **прадстаўнік упраўлення культуры Мінаблвыканкама Аляксандр ШАСТАКОЎ:**

— Музычны праект «Пешаходка» будзе праходзіць у сталіцы ў тыя ж дні. Гэта фэст вулічных музыкантаў. Свабодныя музыкі маюць магчымасць паказаць свае таленты і ўменні на вуліцах і ў пешаходных пераходах. Вызначана 12 пляцовак, на якіх яны выступаюць, — чатыры ў Верхнім горадзе, астатнія ў падземных пераходах. Такая музыка не толькі павышае ўзровень культуры мінчан. Яна развівае турыстычны патэнцыял — замежным гасцям гэта таксама можа быць цікава.

Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ. *nina@zviazda.by*

ЯКАЯ З ПЯЦІ?..

Шматаблічнасць Кармэн і разнастайнасць танца падчас «Балетнага лета»

Фестываль адбудзецца з 11 па 18 чэрвеня ў Нацыянальным акадэмічным Вялікім тэатры оперы і балета Беларусі. Адкрыццё азначыць выступ аркестра беларускага Вялікага тэатра пад кіраўніцтвам маэстра Андрэя Іванова, які сустрэне гасцей імпрэзы цудоўнымі вальсамі Штрауса. Першым балетам праграмы абралі «Лебядзінае возера» Пятра Ільіча Чайкоўскага. Партыі Адэты-Адыліі ды Зігфрыда выканаюць салісты балета Нацыянальнай оперы Украіны Анастасія Шаўчэнка і Станіслаў Альшанскі. Наступным разам у чароўнай атмасферы «Лебядзінага возера» будуць танцаваць вядучая салістка Тбіліскага дзяржаўнага тэатра оперы і балета Ніно Самадашвілі і заслужаны артыст Расіі Ігар Колб з Марыінскага тэатра (Санкт-Пецярбург).

Артысты тэатра «Астана Балет» падрыхтавалі для беларусаў насычаную гастрольную праграму. У межах фестывалю яны пакажуць аднаактавыя балеты «Love Fear Loss» (створаны па матывах біяграфіі Эдзіт Піяф на аснове музыкі спявачкі), «Gaia» (сучасны харэаграфічны расповед пра лёс планеты Зямля на музыку Хекеля Тавераса і Ісака Альбеніса), а таксама «Туманы часу» Ісяна Чжана, маладога харэографа з Кітая. Разынкай аднаактавага балета-фантазіі «Кармэн» будзе з'яўленне на сцэне ажно пяці Кармэн! Паглыбіцца ў гісторыю балетнага сусвету дапаможа работа харэографа Рыкарда Амарантэ. Яго рэтраспектыўная пастаноўка «Разнастайнасць танца» адлюстравала станаўленне харэаграфічнага мастацтва. Лепшыя нумары з рэпертуару казахстанскага тэатра прадэманструе танцавальная праграма «Астана Балет GALA».

Фіналам «Балетнага лета» стане гала-канцэрт зорак сусветнага балета, дзе разам з артыстамі Вялікага тэатра Беларусі на сцэну выйдуць славутыя танцоўшчыкі і оперныя спевакі з Расіі, Казахстана, Польшчы, Германіі.

Дар'я ЧАРНЯЎСКАЯ.

■ Выстаўка

У ПРОФІЛЬ І АНФАС...

Псіхааналіз праз мастацтва як спосаб зразумець Усяслава Чарадзея ці Вітаўта Вялікага

Ігар Лучанок прыйшоў паглядзець, як яго вобраз упісаўся ў выставачную прастору. Асабіста падтрымаў скульптара Івана Міско, які стварыў яго партрэт. Прысутныя — падчас адкрыцця выстаўкі «Псіхалогія вобраза» ў Палацы мастацтваў іх было шмат — маглі на свае вочы пабачыць, наколькі дакладна аўтар партрэта перадаў падабенства і яшчэ ўхапіў характар свайго героя, знакамітага кампазітара. Зрэшты, прайшоўшы па выстаўцы, можна было зразумець: справа не ў дакладнасці ды падабенстве, хоць для партрэтнага жанру гэта падаецца вызначальным. Але ў XXI стагоддзі мастацтва сягае далей ды глыбей, і адчуць чалавека можна нават праз дэталь, эмоцыю ці асобны колер. Альбо праз адносіны да яго мастака.

Партрэт цяпер іншы, чым яшчэ стагоддзе таму. Але і гісторыю развіцця гэтага жанру можна ўявіць дзякуючы выстаўцы ў Рэспубліканскай мастацкай галерэі Беларускага саюза мастакоў. Частка гісторыі партрэтнага жывапісу — гэта творы майстроў, што складалі славу беларускаму мастацтву ў мінулым стагоддзі: Гаўрылы Вашчанкі, Аляксандра Кішчанкі, Уладзіміра Стальмашонка ці Мая Данцыга... Але іх вучні і творчыя нашчадкі ідуць іншым шляхам, праз пошукі і сэнсу, і формы, эксперыментуючы з матэрыяламі і тэхнікамі. Прытым галоўнае, што нясе гэты жанр, — адчуванне самога чалавека.

Выстаўка «Псіхалогія вобраза» — гэта спроба ўглядзецца ў чалавека. У героя мінулага і сучасніка. У таго, каго называюць і лічаць героем. І ў звычайнага мінака. У чалавека супярэчлівага ці ў душу наіўнага дзіцяці. Таго, хто побач, у блізкага ды свояка — родныя часта становяцца любімымі мадэлямі творцаў. Ды нават можна ўглядзецца ў сябе самога — і гэта цікава не толькі тым, як творцы бачаць сябе збоку, гэта частка той жа з'явы, за якой паўстае мастацкі партрэт часу: яго праявамі і рысамі будуць, акрамя герояў, яшчэ і сродкі выяўлення, тэхніка аўтара.

Зразумела, што калі называюцца імёны рэальных асоб, то хочацца, каб вобраз адпавядаў рэальнасці. Асабліва, калі людзей ужо няма сярод жывых, напрыклад Максіма Багдановіча, Васіля Быкава ці Алеся Адамовіча. Майстэрства творцаў дапамагае захаваць вобразы для нашчадкаў. Але калі гісторыя ідзе ўглыб стагоддзяў, то складана нават уявіць, якім быў легендарны Усяслаў Чарадзей ці як выглядала ў жыцці (а не на іконах) святая Ефрасіння Полацкая. І тады мастакі становяцца яшчэ і гісторыкамі, якія не проста фіксуюць і пераказваюць, а дапамагаюць адчуваць і

Галіна БЛАГАРЭНКА. Медуза.

разумець легенды, падставы да якіх давала яшчэ, а таксама замацоўваюць у свядомасці сучасных людзей тое, што ад іх далёка. Транслююць вобразы і злучаюць з часам.

Яны здольныя нават інтэрпрэтаваць тыя вобразы, якія калісьці выкарыстоўвалі ў выяўленні сябе іншыя творцы, вялікія сімвалісты і маштабныя асобы. Вось што можна лічыць самым пазнавальным сімвалам Францыска Скарыны? Сонца ў саюзе з маладым месяцам — два ў адным, але нават не трэба выявы чалавека (тым больш што мы яе ўяўляем па гравюрах у яго кнігах, у нейкім сэнсе аўтапартрэтах), дастаткова вось гэтага прыгожага вобраза, каб разумець, пра каго гаворка. І такім можа быць партрэт — сімвалічны — як паказаў Валерый Шчасны ў творы «Чалавек Божы».

Ды любы можа быць партрэт — у драўлянай скульптуры і шкле, вылеплены ў гліне і адліты ў бронзе, напісаны алеем і адлюстраваны мінімумам графічных сродкаў. Ён можа быць стрыманы і экспрэсіўны, нават абстрактны і цалкам фармальны. Засяроджаны на ўнутраным стане, калі сапраўды хочацца зразумець: а чаму гэта так, чаму чалавек TAKI? Рэзкі і рашучы, як, напрыклад, у «Аўтапартрэце з птушкай» Алеся Ксяндзова. Ці з асаблівым поглядам, як у Івана Сямілетава. Чалавек можа патрапіць у «Пастку часу», як падаецца Ганне Селівончык. І ў заспакоенасці хаваць напружанасць, як у партрэтах Зоі Літвінавай. Колькі б ні было людзей і вобразаў, у кожным партрэце ёсць свая псіхалогія, імкненне да паразумення са светам. Ці з самім сабой — бо кожны чалавек як сусвет.

А ў такой канцэнтрацыі партрэтныя творы яшчэ і ствараюць вобраз часу, і не толькі для адной асобы. Гэта калектыўны вобраз. Нават калі гаворка пра творы мінулага ці пра мінулае — уступае ў дзеянне цяперашняе наша ўспрыманне. Таму ўсе разам — творы яшчэ даюць уяўленне пра вобраз краіны — з мінулым і цяперашнім часам, і нават з адчуваннем будучыні. Прынамсі, усю выстаўку можна ў нейкім сэнсе лічыць партрэтам нашага часу ці аўтапартрэтам беларускага мастацтва на сучасным этапе. Гэты партрэт стракаты і эмацыянальны, непрычэсаны і непарадны, у ім шмат колераў і адценняў. Шмат вобразаў і твараў. Таму што шмат мастакоў адначасова паказваюць сябе, так што цяжка абраць, засяродзіцца на нечым творы. Але ёсць вобразы, якія, магчыма, пойдуць з выстаўкі разам з вамі.

Шмат — гэта ў нашых рэаліях добра. Бо мастацтва ніколі не будзе зашмат. Галоўнае, каб не было мала...

Ларыса ЦІМОШЫК. *tsimoshyk@zviazda.by*

алімпіец
ЗВЯЗДА
ВЫПУСК №6 (55)
Сумесны праект газеты «Звязда», Нацыянальнага алімпійскага камітэта і Міністэрства спорту і турызму Рэспублікі Беларусь

■ Баскетбол

«ПАЛОВА» ВЯРТАЕЦЦА!

Беларуская федэрацыя баскетбола паведамляе, што аднаўляецца штогадовы рэспубліканскі турнір па баскетболе 3х3.

Ужо вядуцца работы па ўстаноўцы баскетбольных пляцовак на «Палова-Арэне» пад купалам на праспекце Пераможцаў каля Палаца спорту. Засталося ўзгадніць апошнія «папяровыя» дэталі, неабходныя для працаздольнасці гэтага праекта, і ўжо ў хуткім часе аматары баскетбола змогуць абсалютна бясплатна атрымліваць асалоду ад любімай гульні пад купалам на адкрытым паветры.

Правядзенне першага этапу нацыянальнага турніру «Палова-2017» плануецца ўжо ў канцы чэрвеня.

Тэрміны астатніх этапаў:
II этап — 22—23 ліпеня;
III этап — 19—20 жніўня;
IV этап — 2—3 верасня;
Фінал — 16—17 верасня.

З БЭНТЛІ Ў СКЛАДЗЕ

Жаночая баскетбольная зборная працягвае падрыхтоўку да чэмпіянату Еўропы. Пасля амаль месячнага збору ў Раўбічах і мінскага турніру Халіпскага, каманда пад кіраўніцтвам Наталлі Трафімавай правяла дзве таварыскія сустрэчы з баскетбалісткамі зборнай Латвіі (адзін матч завяршыўся з нічыйным вынікам 60:60, другую гульню выйгралі латышкі — 73:66).

Пасля чаго беларускія спартсменкі адправіліся ў Грэцыю, дзе прынялі ўдзел у прадстаўнічым міжнародным турніры. Саперніцамі нашай дружыны сталі зборныя Грэцыі, Украіны і Расіі.

Адзначым, што ў гэтым турніры дэбютавала натуралізаваная амерыканка Аляксандра Марыя Бэнтлі, якая не так даўно атрымала беларускі пашпарт.

У фінальнай частцы чэмпіянату Еўропы нашы дзяўчаты стартуюць 16 чэрвеня ў чэшскім Градзец-Кралаве. Сярод саперніц па групе — італьянкі, славачкі і турчанкі

■ Па-за гульнёй

НАШЫ Ў СПІСЕ ЛЕПШЫХ

Беларусы Арцём Кулак, Арцём Каралёк і Андрэй Юрынок намінаваныя на званне лепшага маладога гандбаліста свету. Традыцыйнае галасаванне па выніках сезона праводзіць папулярны інтэрнэт-партал handball-planet.com. Сёлета разглядаюцца кандыдаты з ліку тых, хто нарадзіўся ў 1995 годзе ці пазней. Два папярэднія такія конкурсы выйграў нарвежскі разыгрываючы Сандэр Сагасен.

Выбар лепшага маладога гандбаліста планеты адбываецца з дапамогай галасавання журы, складзенага з вядомых гандбольных журналістаў дванаццаці краін (у іх ліку беларус Сяргей Новікаў), а затым балельшчыкаў у інтэрнэце.

Па выніках журналісцкага галасавання ў лік намінантаў (па чатыры ў кожным амплуа) уключаны адразу тры беларусы: лінейны «Сен-Рафаэля» Арцём Каралёк, левы крайні Андрэй Юрынок і разыгрываючы Арцём Кулак з БГК імя Мяшкова.

Ужо адкрыта галасаванне заўзятараў у інтэрнэце

■ Біятлон

ПАЧЫНАЮЦЬ ПАДРЫХТОЎКУ

Жаночая біятлонная каманда завяршыла трэніроўкі ў спарткомплексе «Раўбічы» і з 9 па 29 чэрвеня працягне падрыхтоўку да сезона ў Хахфільцэне.

У Аўстрыю адправіцца лідар зборнай Дар'я Домрачава, а таксама Надзея Скардзіна, Ірына Крыўко, Надзея Пісарава і Ганна Сола.

Мужчынская каманда працягне трэніравацца ў «Раўбічах», а пасля адправіцца ў Санкт-Пецярбург, дзе біятланісты паспрабуюць свае сілы ў спецыяльным снежным тунэлі, адкрытым два гады таму на тэрыторыі вучэбна-трэніровачнага цэнтра Нацыянальнага дзяржаўнага ўніверсітэта фізічнай культуры, спорту і здароўя імя П.Ф. Лесгафта.

Нагадаем, новы біятлонны сезон стартуе 26 лістапада ў шведскім Эстэрсундзе. Зімовыя Алімпійскія гульні пройдуць з 9 па 25 лютага 2018 года ў карэйскім Пхенчхане

КЛУБНЫ сезон у беларускім гандболе завершаны, цяпер уся ўвага балельшчыкаў і ўсіх неабыякавых да ручнога мяча людзей прыкавана да нацыянальных зборных, якія працягваюць змагацца за выхад на топ-турніры. Праз тыдзень наша мужчынская каманда сустрэнецца з румынамі, а яшчэ праз пару дзён з сербамі, у гэтых паядынках вырашыцца, ці паедзе дружына Юрыя Шаўцова на чэмпіянат Еўропы 2018 у Харватыю.

Максім БАБІЧАЎ:

«НАВАТ МУЛЯЖ ГРАНАТЫ НА ПЛЯЦОЎКУ КІДАЛІ»

Гандбаліст з эканамічнай адукацыяй і званнем шматразовага чэмпіёна краіны па ВМХ расказвае пра самых нестандартных балельшчыкаў

www.bgk-meshkova.com

Напярэдадні адказных гульняў мы пагаварылі з лінейным беларускай зборнай Максімам Бабічавым, які падвёў вынік свайго выступлення за БГК імя Мяшкова, расказаў пра пераход ва ўкраінскі «Матор» і вярнуўся на 10 гадоў назад, каб успомніць свае першыя крокі ў нацыянальнай камандзе.

— Максім, сёлета разам з БГК вы ўжо каторы раз сталі чэмпіёнам краіны, радасці было не так шмат, як першы раз?

— Калі Дзіму Нікуленкаву ўручылі Кубак, не было нейкіх звышэмоцый, можа быць, мы проста былі стомленымі, усё ж такі, правялі дзве гульні за два дні. Да таго ж разумелі, што ўсё скончылася, і спакойна выдыхнулі. Адчувалася нейкае спусташэнне яшчэ і з-за таго, што ведалі, гэта наша апошняя гульня ў такім складзе — многія хлопцы пакідаюць клуб.

— У фінальнай серыі супраць мінскага СКА брэстаўчане праблем не зазналі, ці так здаецца толькі з боку?

— Хацелі выйграць фінал за 3 гульні, таму што ўвесь сезон ішлі без паражэнняў ад армейцаў. У паўфінале атрымалася асечка з гродзенскім «Кронанам» — прайгралі, для нас гэта стала аплявухай, каманда прачнулася. У фінальнай серыі са СКА настройваліся на сур'ёзную барацьбу, так і атрымалася. Асабліва ў першым матчы, калі гульцы Ігара Папругі добра беглі, забівалі з контратак, у нейкі момант мы аказаліся не гатовыя да гэтага. Толькі ў трэцяй гульні склалася кардынальна іншая сітуацыя, думаю, там маладыя хлопцы падселі фізічна, беглі толькі да 15 хвіліны. Шчыра кажучы, мы былі здзіўлены.

— Пасля фіналу чэмпіянату аб праблемах СКА ў прэсе кажуць шмат...

— Усе яны на паверхні — маладосць і недахоп гульнявой практыкі. Але хлопцы ў СКА добрыя, упэўнены, хто застанецца ў камандзе ў наступным годзе, абавязкова дадасць. Не чакаў, што так шмат гульцоў пакіне клуб, але ў іх ужо даўно так склалася, што на змену адным прыходзяць іншыя, не менш таленавітыя гандбалісты.

— У мінскім клубе пачынаюць з'яўляцца першыя легіянеры, што думаеце пра гэта?

— Я быў здзіўлены. Але ў легіянерах заўсёды ёсць плюс, нават для такой каманды, як СКА, у якой галоўная мэта вырошчваць годную моладзь. Прыезджыя гандбалісты ствараюць канкурэнцыю, і калі беларус хоча трапляць у склад, то давядзецца даказваць, што варты гэтага месца. Іншае пытанне — якая колькасць легіянераў павінна быць у клубе, цяпер гэтая праблема ўзнікае ў многіх краінах і чэмпіянатах.

— Вернемся да БГК, як ацэніце выступленне клуба ў Лізе чэмпіёнаў і СЕХА-лізе?

— У гэтым сезоне мы дадалі, гулялі больш упэўнена, цудоўна разумелі, што дома можам абыграць любую каманду. І нават, калі прайшлі ў 1/8 Лігі чэмпіёнаў, ведалі, што можам змагацца далей. Крыўдная гісторыя атрымалася з СЕХА-лігай, там усё вырашылася па пенальці, а гэта, як вядома, латарэя.

— За каго хварэлі ў фінале Лігі чэмпіёнаў?

— Не магу сказаць, што за катосьці канкрэтна, але мне было прыемна, што выйграў «Вардар», бо некаторых гульцоў з яго складу ведаю асабіста.

— За БГК вы гулялі тры з паловай гады, як ацэніце гэты перыяд сваёй кар'еры?

— Калі распалася мінскае «Дынама», трэба было хутка шукаць клуб, дамовіліся з Брэстам. Я быў рады застацца ў Беларусі, ды яшчэ і ў добрай камандзе. Да таго ж туды з «Дынама» перайшоў не толькі я, але і Дзіма Нікуленкаў, з якім мы знаёмыя з 1996 года, Дзяніс Рутэнка, Сяргей Шыловіч.

У БГК я стараўся па максімуме выкарыстоўваць усе шанцы, якія мне давалі, каб не падвесці каманду. А як гэта атрымалася, меркаваць не мне. Калі казаць пра самы паспяховы сезон з трох, то назаву, напэўна, цяперашні. Сабраўся вельмі добры калектыў, было шмат добрых перамог над вартымі камандамі, у клубе выдатна працаваў маркетынг, прыемна было гуляць у такой абстаноўцы — антураж, перадматчавыя шоу, падтрымка брэсцкіх балельшчыкаў.

— Нядаўна стала вядома, што вы пераходзіце ў «Матор» ...

— Былі перамовы і з БГК, і з «Маторам», але так атрымалася, што я абраў другі варыянт. Вядома, раіўся з Борам Пухоўскім, з Сашам Цітовым, у якіх ёсць вопыт гульні ў Запарожжы. З многімі ўкраінскімі хлопцамі мы гулялі ў «Дынама», так што размаўляў і з імі. Сам злятаў туды, паглядзеў на інфраструктуру клуба, у інтэрнэце бачыў гульні каманды. Кажуць, да зімы павінны пабудаваць новую арэну для клуба, і Лігу чэмпіёнаў «Матор» будзе гуляць ужо там.

— Як чалавек сямейны, напэўна, думалі аб зручнасці жонкі і сына?

— Так, мы вельмі доўга абмяркоўвалі з жонкай пераезд, пакуль вырашылі, што сям'я застанецца ў Мінску, так будзе лепш для іх.

— Пагаворым пра зборную, як вам становішча каманды ў адборачнай групе?

— Быццам бы і неблагое, але хацелася б заняць першае месца ў квартэце. Будзем змагацца да апошняга, хочацца перамагаць! Нас чакаюць дзве складаныя гульні. Першая з румынамі — каманда вельмі жорсткая, сілавая, агрэсіўная, у нас ужо ёсць пэўны план, як ім супрацьстаяць, мы працуем над ім на трэніроўках. У першым матчы штосьці пайшло не так — прайгралі.

— Гульня палякаў у цяперашнім адборачным цыкле здзівіла?

— Зараз яны на апошнім месцы ў групе, напэўна, гэтага мала хто чакаў. У палякаў ідзе перастраенне каманды, таму такі спад у гульні. Многія добрыя гандбалісты ўжо ва ўзросце, ім трэба шукаць замену. Якія эмоцыі выклікала адстаўка Таланта Дуйшэбаева? Цяжка меркаваць, ніхто не ведае, што ў іх там адбывалася ўнутры каманды. Але, наогул, Талант — добры спецыяліст, выдатна кіруе камандай, шмат чуў пра яго добрага. Як я разумею, гэта было яго рашэнне. Адмовіцца трэніраваць зборную цяжка, ён прыняў рашэнне, як сапраўдны мужчына. Дуйшэбаеў мне вельмі падабаецца тым, што заўсёды брэ адказнасць і віну на сябе.

— На цяперашнюю беларускую моладзь кіраўніцтва федэрацыі ды і балельшчыкі робяць вялікую стаўку, у тым ліку яна датычыцца трапляння на Алімпійскія гульні 2020.

— Усё трэба праходзіць паступова, мне здаецца, Гульні — гэта яшчэ так далёка, таму не хачу нічога казаць з гэтай нагоды. Добрыя, баявыя хлопцы ды і мы пакуль у форме. Цяпер намецілася такая тэндэнцыя — актыўнага ад'езду маладых гульцоў за мяжу, самае галоўнае, каб яны стараліся трапляць у добры чэмпіянат і гулялі там, а не сядзелі на лаўцы.

— Моладзь вельмі адрозніваецца ад вашага пакалення?

— Цяжка сказаць. У зборнай мы ўсе выдатна знаходзім агульную мову, разумеем адзін аднаго і на пляцоўцы, і за яе межамі. Усё даказваецца ў рабоце, ніякай дзедаўшчыны ў нас няма. Раней Юрый Анатолевіч Шаўцоў праводзіў шмат розных псіхалагічных тэстаў, каб стварыць добры мікраклімат у калектыве, цяпер ужо ўсе і самі ведаюць, хто чаго варты. Ды і ў псіхалогіі штосьці памянялася, шмат да чаго мы пачалі ставіцца па-іншаму.

— Свае першыя крокі ў зборнай памятаеце?

— Я прыйшоў у яе ў 18—19 гадоў, Спартак Пятровіч Мірановіч узяў мяне на кваліфікацыю да чэмпіянату свету. Я тады дзве першыя гульні адсядзеў на лаўцы, але для мяне гэта было такое шчасце — мяне ўзялі ў склад, у гэтыя 16 чалавек. Я ганарыўся наогул, што трэніраваўся з імі, што аказаўся ў зборнай у такім узросце. Вельмі стараўся, маўчаў, усё рабіў, і мячы насіў і ваду. Дзедаўшчыны таксама ніякай тады не было. Максім Няхайчык вучыў шмат чаму, рыхтавалі мяне як абаронцу, таму працавалі з ім у пары.

Мірановіч мне многае даў, вялікі дзякуй кажу і сёння, што тады ў мяне паверыў, разгледзеў нешта ў такім юным гульцы. Цяпер заўсёды, калі бачу Спартака Пятровіча, хочацца падысці, павітацца, паціснуць руку. Ён легендарны, вельмі прыемны чалавек. Нягледзячы на свой узрост, заўсёды вельмі тонка і востра жартуе.

